Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 34 (2832) Год LV | Беласток, 22 жніўня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Для мяне існавала толькі Радзіма... Адчайны бой з адзічэлымі сіламі рэакцыі, не, не за сябе, але за Радзіму, за нашу праўду, за зняволены-пераняволены наш народ... Я не ведала, што йсці на смерць за Радзіму так святочна...

ВЕК ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У суботу 7 жніўня творчая інтэлігенцыя Беларусі — літаратары, гісторыкі, прыхільнікі асобы і творчасці — з'ехалася ў Зэльву адзначыць стагоддзе з дня нараджэння беларускай паэткі і патрыёткі Ларысы Антонаўны Геніюш. Пілігрымка да легендарнай патрыёткі адбылася два дні да сотых угодкаў ад дня яе нараджэння. Рыхтавалася літаратурна-музычнае мерапрыемства ў мясцовым доме культуры, поўнасцю афіцыйная імпрэза. І сапраўды, у РДК адбылася сустрэча, у бібліятэцы на трыццаць асоб, на дзве гадзіны раней, а галоўны ўваход быў закрыты для соцень прыбылых на свята. Пасля таго, як 4 жніўня зэльвенскія ўлады сарвалі мемарыяльную дошку з дома Ларысы Геніюш, было сумніўным прымаць удзел у афіцыйным райвыканкамаўскім мерапрыемстве ў доме культуры.

Адкуль тое змаганне ўлады з нацыянальным геніем беларускай паэзіі? Міхась Скобла лічыць, што беларуская ўлада сама па сабе не можа растлумачыць прычыны гэтай нянавісці: „Гэта проста вайна з беларускай літаратурай. Вайна з Ларысай Геніюш, якая працягваецца ад 1948 года, калі яе першы раз арыштавалі, прытым незаконна. Арыштавалі яе як савецкую грамадзянку і на гэтай аснове вывезлі з Чэхіі. Нягледзячы на гэта, што яна ніколі савецкай грамадзянкай не была. Усё, што звязана з Ларысай Геніюш, выклікае ў беларускіх улад агрэсію... Адкуль ідуць каманды і забароны, не ведаю. Ды ўжо на працягу 10 гадоў, адкуль мы збіраемся на яе радзіме ў Зэльве, праходзяць падобныя эксцэсы. Улады думаюць, што такім спосабам Ларысу Геніюш можна перамагчы. Ды перамагчы літаратуру немагчыма Гэта тое самае, што страляць з рагаткі па зорках!”.

У Зэльву прыехалі мінчукі, гродзенцы, мастоўцы, віленчукі. Былі госці з Масквы, Ліды. Хоць супраць прымаць удзел у мерапрыемстве было кіраўніцтва чаргінцоўскага саюза пісьменнікаў, на свяце бачыліся таксама і ягоныя члены. Гродзенцы спазніліся на мерапрыемства дзве гадзіны — спачатку аўтобус спыніла транспартная інспекцыя, пасля на чыстай дарозе прабілася кола (запаснога новы аўтобус не меў), чакалі наступнага паўтары гадзіны, які столькі часу ехаў 40 кіламетраў...

Свята ў Зэльве пачалося ў 10 гадзін з памінальнай службы ў Свята-Троіцкай царкве. Там была таксама адкрыта памятная экспазіцыя, прысвечаная Ларысе Геніюш. Помнік Ларысе Геніюш стаіць ля царквы, якой яна была прыхаджанкай. Мемарыяльная дошка і помнік Ларысе Геніюш па блаславенні мітрапаліта Філарэта ўстаноўлены на тэрыторыі прыхода Свята-Троіцкай царквы. Кожны год, 7 красавіка, у гадавіну смерці паэткі, у Петрапапаўлаўскім саборы Мінска служыцца паніхіда ў яе памяць...

Увесь час за ходам мерапрыемства сачылі ўлады — назіралі міліцыянты, патрабавалі схаваць бел-чырвона-белыя сцягі, што залуналі над магілай Геніюшаў. Міхась Скобла ўручыў памятныя медалі да стагоддзя Ларысы Геніюш. Першы атрымаў Міхась Чарняўскі, які ўратаваў архіў паэткі. Медаль быў уручаны Міхасю Геніюшу, беластачаніну, унуку паэткі, які сказаў: *Дзякуючы вам, памяць пра маю бабулю і слова, якое яна нам усім пакінула ў вершах, — жывуць у нашых сэрцах. Дзякуючы вам справа, якой яна прысвяціла свае жыццё — не змарнавалася.*

Ад царквы мы пайшлі да дому Ларысы Геніюш. Здымак шыльды, якую ўкралі міліцыянты, Генік Лойка і Уладзімер Някляеў прыбілі да сцяны. Люба Уладзіміраўна, якая жыве цяпер у гэтым доме, дала згоду на тое, каб шыльда вісела на яе доме. Прэзентацыя двухтомніка твораў паэткі Ларысы Геніюш „Проза” і „З эпісталярнай спадчыны” ды біяграфічнага альманаха „Асоба і час”, чытанне вершаў і спяванне песень адбыліся на прыступках дома культуры...

Геніюшаў — Ларысу і яе мужа Янку, прайшоўшых допыты Цанавы, на 25 гадоў загналі ў лагеры ў Комі і Мардовіі. Асвабадзілі іх 10 чэрвеня 1956 года. Ды да гэтай пары не рэабілітавалі. Яны пасяліліся былі ў Зэльве на былой Царкоўнай вуліцы, якраз насупраць Свята-Троіцкага храма. Ды і так засталіся ў „зоне”. Памерла Ларыса Антонаўна ў бальніцы, ад рака, у 1983 г., да канца жыцця не прыняўшы савецкага грамадзянства. Асоба без зямнога грамадзянства адышла з роднай Беларусі 7 красавіка 1983 года...

На доме па вуліцы Савецкай на 7 жніўня мела быць адкрыта памятная дошка, якую выканаў скульптар Алесь Шатэрнік. З райвыканкама ў дом прыходзіў спадар Кулікоў з ідэалагічнай службы і загадаў дошку зняць, паведаміўшы гаспадарам хаты, што не было на яе дазволу раённага выканаўчага камітэта. Улады мелі „даць прававую ацэнку” гэтаму факту. 27 ліпеня ў Ваўкавыску міліцыянты тайком сарвалі памятную дошку і арыштавалі яе разам з аўтарам з дому па вуліцы Перамогі, 40, дзе нарадзілася паэтка (дошку ўстанавілі актывісты). Выканаў яе быў пры фінансавай падтрымцы кампаніі „Гавары праўду!” мясцовы краязнаўца Мікалай Кавальчук...

Улады палічылі надаць вуліцы Савецкай (пры якой пражывала Ларыса Антонаўна і пры якой знаходзіцца храм, якога была прыхаджанкай ды імпазантны дом культуры, у які ніколі не была запрошана) імя Ларысы Геніюш немэтазгодным. Намеснік старшыні райвыканкама па ідэалогіі Валянцін Семяняка патлумачыў гэта 30 чэрвеня: „Для большасці жыхароў слова „Савецкая” з'яўляецца важным гістарычным паняццем, асацыюецца з іх маладосцю і ўпэўненасцю ў заўтрашнім дні, вялікай перамогай над фашызмам, эканамічнымі і сацыяльнымі дасягненнямі краіны”. Надалей збіраюцца Яўгенам Скрабутанам і іншымі акывістамі подпісы на тое, каб у Зэльве з'явілася вуліца Ларысы Геніюш. Пакуль на спіску свае подпісы паставіла дзвесце жыхароў вуліцы Савецкай у Зэльве.

Уладзімер Арлоў: „Была ў мяне бабуля Аўгіння, якая з жыцця пайшла рана. Але з'явілася ў мяне другая бабуля — бабуля Ларыса. Не толькі мне яна была бабуляй. І мы нават у яе на гасцінах называлі яе бабуляй. Мы тады яшчэ не карысталіся такімі словамі як „маральны аўтарытэт”. Яна была нашым маральным аўтарытэтам. Так рана скончылася яе жыццё. Яна паэтка, нязломная беларуская хрысціянка... Мне згадваецца яе пахаванне. Калі трэба было выносіць яе труну, загадалі яе везці ў кузаве грузавіка і не дазволілі, каб людзі неслі крыж. Але мужчыны неслі яе праз усю Зэльву на плячах. (...) І прыйдзе час, калі вуліца Савецкая будзе звацца яе імем. Будзе вісець не толькі мемарыяльная дошка, але і будзе стаяць помнік, а пры адкрыцці вось гэтыя людзі ў форме будуць сачыць за парадкам... Жыве паэзія Ларысы Геніюш, жыве Беларусь”!

Пасля поўдня ў лесе ля зэльвенскага вадасховішча адбылася вечарына паэзіі.

ЗАПРАШЭННІ

Гайнаўскі дом культуры і Бурмістр горада Гайнаўкі сардэчна запрашаюць на

VI ВЯСЕЛЬНУЮ БЯСЕДУ

якая адбудзецца 29 жніўня 2010 г.:

Ад гадз. 12.00:
- спроба пабіць рэкорд Гінеса ў намінацыі „гатаванне 2000 літраў белавежскага супу” з удзелам д-ра Гжэгажа Русака — кухара, апавядальніка, старшыні Польскай палаты рэгіянальнага прадукту;
- выстаўка паляўнічых сабак;
- паказ і дэгустацыя страў паляўнічай і рэгіянальнай кухні;
- віртуальны паляўнічы цір;
- выстаўка паляўнічых калекцый.

Ад гадз. 16.00:
- вясельныя абрады і традыцыі ў выкананні польскіх і беларускіх калектываў з удзелам публікі;
- вясельны пачастунак для публікі;
- вясельная забава.

Бурмістр горада Бельск-Падляшскі і Бельскі дом культуры запрашаюць на канцэрт

Падляшскія сустрэчы

у рамках V Міжнароднага фальклорнага фестывалю які адбудзецца 19 жніўня 2010 г.

У праграме:

15:30 — карагод калектываў вуліцамі горада.

16:00 — канцэрт калектываў у гарадскім амфітэатры ім. каралевы Алены. Выступяць калектывы з Польшчы, Сардыніі, Грузіі, Украіны, Турцыі і Узбекістана, у тым ліку бельскія «Куранты».

Інфармацыя і носьбіты

Прымаўка „хто мае інфармацыю — той валодае светам” не страціла актуальнасці і ў нашыя дні. Праўда, інфармацыі гэтай пры сучасных тэхналогіях ліецца такая плынь, што вельмі часта надзвычай цяжка адрозніць сапраўдныя падзеі і факты ад танных сенсацый і фантазій безадказных аўтараў. У Рэспубліцы Беларусь інфармацыя старанна фільтруецца і дазуецца. Менавіта таму зачыненая абсалютная бальшыня незалежных газет, а новыя не паўстаюць. З іншага боку тыраж дзяржаўных рупараў штучна падвышаны прымусовай падпіскай па месцах працы. Практычна ў кожнай дзяржаўнай установе і прадпрыемстве працаўнікоў гвалтоўна абавязваюць выпісваць газеты менавіта з урадавага пераліку.

Згадваецца, як у васьмідзесятыя гады крыніцай інфармацыі, аналітыкі, навізны была для нас дзяржаўная газета „Літаратура і мастацтва”. ЛіМ у сваёй гісторыі перажыў некалькі этапаў. У савецкі час яго саркастычна называлі „Лесть і месть” [Ліслівасць і помста — рэд.], потым прыйшла жывільная перабудова і слаўны перыяд штотыднёвіка, пасля, ужо пры сучасным рэжыме, газета стала няўгоднай і яе прыбралі ў дзяржаўны холдынг, адпаведным стаў і змест. Такі ЛіМ стаў непатрэбным нікому. Якая літаратура, якое мастацтва? У Гродне ў шапікі „Белсаюздруку” гэтая газета ўвогуле не паступае (і гэта ў абласным цэнтры!). Што ўжо казаць пра вальнадумныя выданні. Праўда, не так даўно дазволілі афіцыйна прадаваць праз гэтыя шапікі „Народную волю” і „Нашу ніву”, але іх музыка хіба доўга не нагучыць. Нашаніўцы адразу атрымалі ажно два папярэджанні, канешне, за публікацыі датычныя прэзідэнта. А менавіта за тэксты аб прапагандысцкім фільме „Хросны бацька”, што прайшоў па расійскім канале НТВ і быў „выразаны” для беларускага гледача. Для мяне асабіста рэакцыя на гэты досыць прымітыўны фільм сталася сапраўднай сенсацыяй. Яго папулярнасць у інтэрнэце пабіла ўсе нацыянальныя рэкорды. Многія з людзей, як выявілася, былі амаль у шоку, хоць нічога, здавалася б, новага ў фільме не прагучала і не было паказана. Але ж насамрэч становіцца ясна, што нават адукаваныя людзі не маюць рэальнай інфармацыі пра тое, што дзеецца ў іх роднай краіне: пра знікненні апазіцыйных палітыкаў, пра асабістае жыццё першай асобы дзяржавы, пра рэальны гаспадарчы „феномен”.

Народ адвык ад праўдзівай інфармацыі, ад грамадскіх дыскусій, ад палітычных дэбатаў. Усяго гэтага даўно няма ў дзяржаўных тэлеканалах і газетах. І тут паўстае сакраментальнае пытанне: а ці хочуць увогуле людзі ведаць праўдзівую інфармацыю? Ці ў іх галовах адно жоўтыя плёткі, скандалы ў сексуальных выбрыках эстрадных зорак, тое, што завецца папулярным цяпер слоўцам „гламур”? Дзяржаўныя ідэолагі добра ведаюць чым лепей забіваць мазгі суайчыннікам і ад якой непажаданай інфармацыі пажадана абмежаваць гасцей. Так у Гродне паказальна ліквідавалі кіёск з прэсай у адной з найбуйнейшых гасцініц „Беларусь”. І сапраўды, навошта людзям чытаць, хай лепш гарэлку глушаць у рэстаране — гарэлка ў такіх установах ніколі не сканчаецца.

А ў іншым гродзенскім гатэлі захацеў купіць я незалежную спартовую газету „Прессбол”. Рэакцыя маладзенькай кіяскёркі была проста замілавальнай. З рэдкай прастадушнасцю яна паведаміла: „Так, мы атрымліваем адзін нумар гэтай газеты, але яго спярша наш дырэктар чытае, вось зараз якраз узяў!”. І прапанавала мне „Спортивную панораму”, якой ляжаў цэлы стос. Ад правільнага органа міністэрства спорту і нацыянальнага алімпійскага камітэта я, канешне, адмовіўся, парадаваўшыся за дырэктара...

Так што вольнае слова ў кватэры і мазгі нашых грамадзян трапляе досыць рэдка і нерэгулярна. А ад непажаданых улётак паштовыя скрынкі надзейна застрахаваны жалезнымі дзвярыма з дамафонамі. Ды і сама інфарамацыйная актыўнасць апазіцыйных партый істотна знізілася. Вось і атрымліваецца, што перад прэзідэнцкімі выбарамі галоўнае заданне дэмакратычнага актыву — прабіць інфармацыйную блакаду і давесці праўду да грамадзян. Толькі носьбітаў гэтай праўды засталося мала.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Майстэрня фільма і старой фатаграфіі Міхалова-Нязбодка

Пра праект расказвае Тамаш Вісненўскі:

— Працягваюцца працы над заснаваннем найбольшай у Польшчы галерэі старых фотаздымкаў і паштовак у Міхалове. У драўляны дом, падараваны горадам Міхалова і цяпер рамантаваны, трапіць каля 35-40 тысяч даваенных фатаграфій, картаў ды іншых дакументаў. Як да гэтага дайшло, можаце прачытаць на You Tube. Хопіць у акенцы пошукавай сістэмы упісаць odrzucona oferta. Галерэя часова будзе называцца Майстэрняй фільма і старой фатаграфіі Міхалова-Нязбодка. Першымі нашымі дзеяннямі будзе выстаўка аб шматкультурнасці горада і Міхалоўскай гміны ды мультымедыйны паказ, прысвечаны Крэсам. Паралельна хочам пусціць у рух іншыя мерапрыемствы, да якіх запрашаем людзей і згуртаванні моцна зацікаўленыя тэмай культурнай спадчыны.

Прапануем прыкладныя праекты:

Цяслярска-мадэльерскія майстар-класы. Праект будзе рэалізавацца ў стратэгічным супрацоўніцтве з Падляшскім музеем у Беластоку. У час майстар-класаў, у аснове на зборы МФСФ, узнікнуць мадэлі неіснуючых старых цэркваў, сінагог ды касцёлаў (таксама дома Людвіка Заменгофа), асабліва з абшару Падляшскага ваяводства (з трыснягу, драўніны, паперы і фанеры). Фіналам праекта будзе выстава, спадарожнічаць якой будзе навуковая канферэнцыя. Майстар-класы будуць мець характар штогадовай „Летняй школы рэканструкцыі драўлянага краявіду”.

Праект Польшча-Нямеччына. Нямецкая спадчына на тэрыторыі Падляшскага ваяводства гэта забыты і слабазведаны раздзел супольнай гісторыі. У Міхалове, Беластоку, Супраслі, Харошчы да ІІ сусветнай вайны дзейнічалі пратэстанцкія касцёлы, у якіх маліліся тутэйшыя немцы. МФСФ мае па гэтай тэме ўнікальныя зборы. Трэба заўважыць, што адсотак нямецкай грамадскасці ў Міхалове быў найбольшы ва ўсім рэгіёне. Працягваюцца ўжо размовы на тэму супольнага мерапрыемства з Міністэрствам адукацыі Нямеччыны.

„Жанчына — дзіця — хустка”. МФСФ мае ў сваіх зборах фатаграфіі жанчын розных веравызнанняў, якія носяць дзяцей у спецыяльных хустках. Мода насіць дзяцей у хустках вяртаецца ў Еўропу. Вакол гэтай тэмы разам з Касяй і Марцінам (chustkomania.pl) будуць сарганізаваны ў Міхалове выстава і міжнародныя майстар-класы.

Польшча-Расія. Гісторыя Польшчы і Расіі пазначана супольнымі пакутамі. У гэтых краінах пражываюць католікі і праваслаўныя, побач сябе, ад стагоддзяў. Абедзве краіны ствараюць усходнюю частку Еўропы з каштоўнай нацыянальнай спадчынай. Незвычайная архітэктура праваслаўных цэркваў прыцягвае гісторыкаў і турыстаў з усяго свету. Багатае рэлігійнае і духоўнае жыццё ў нашых краінах з'яўляецца чымсьці невядомым і незвычайным для заходніх еўрапейцаў. Шмат з гэтых цудоўных аб'ектаў не пратрывала часу вайны і беззваротна прапала з краявіду расійскай дзяржавы. Здымкі нямецкіх салдат гэта апошняя рэгістрацыя іх існавання. МФСФ мае ў сваіх зборах амаль паўтысячы такіх фатаграфій выкананых на тэрыторыі Расіі пад акупацыяй. Хочам паказаць іх на выставе (асабліва таму, што большасць з іх ужо не існуе), а спадарожнічаць будзе ёй навуковая канферэнцыя.

Яўрэйская спадчына — гэтае пытанне нельга абмінуць. Беручы пад увагу разлегласць тэмы, трэба над ёй грунтоўна задумацца. Адным з першых праектаў з'яўляецца стварэнне субгалерэі, якая пакажа апошнія дні тутэйшых яўрэяў — унікальныя здымкі выкананыя нямецкімі салдатамі ў 1939-1943 гадах.

Эсперанцкі праект. Вялікія, унікальныя і даваенныя зборы МФСФ варты значна большай экспазіцыі. Усе гэтыя мерапрыемствы мяркуем паказаць на фільмавым фестывалі, над якога формулай працуем.

— А беларускія праекты? Ёсць жа гаворка аб шматкультурнасці нашых зямель?..

— Асобы, установы і згуртаванні, тутэйшыя, а таксама і замежныя, якія хацелі б удзельнічаць у нашых дзеяннях або маюць свае ідэі, просім кантактавацца з намі. Мой тэлефон: Тамаш Вісненўскі, 507181939, bagnowka@yahoo.pl Больш даведацца можаце на старонках http://www.youtube.com/bagnowka7, http://www.vimeo.com/michalowo.

Міра ЛУКША

Вачыма еўрапейца

Я ім зайздрошчу

Апошнім часам мяне вельмі ўразілі дзеянні двух згуртаванняў. Першае з іх мае сядзібу ў Палічнай пад Кляшчэлямі і носіць мілагучную назву „Паштоўка”. Другое — у Сувалках — гэта Згуртаванне грамадска-мастацкай актыўнасці „Nie po drodze”. „Паштоўка” сарганізавала нядаўна ў пяці мясцовасцях Беласточчыны чарговы Міжнародны мастацкі фестываль „Вэртэп” (больш пра яго на стар. 3). „Не па дарозе” амаль у той самы час у сталіцы Сувальшчыны — свята тэатра „Тэатр-Акцыі 2010 — На Усход”. У абедзвюх імпрэзах паявіліся беларускія матывы, да таго ў майстэрскім выкананні. Дар'юш Скібінскі, родам з Познані, выпускнік лялечнай школы ў Вроцлаве, заснавальнік „Паштоўкі”, гаварыў мне аб сваім мерапрыемстве, значыць, аб „Вэртэпе”, адной з безагаворачных зорак якога быў брэсцкі „Свабодны тэатр”:

— Тут не трэба фестывалю, які змяняе плыні ў тэатры, які будзе шакіраваць ці эпаціраваць сучаснасцю. Тут патрэбны спектаклі і людзі, якія ў сваёй жарсці і творчай сумленнасці да канца застаюцца добрасумленнымі, а нават цалкавіта суб'ектыўнымі, але заўсёды распазнавальнымі ў сваёй стылістыцы.

Як адкрыў ён вёску Палічную?

— Прыязджаў я сюды з жонкай Агатай разы два на летні адпачынак. Аказалася, што там стаіць пустая пошта, будынак званы людзьмі „паштоўкай”. Прыняў я ўдзел у таргах на яе куплю. Купілі мы „паштоўку”, адрамантавалі і якраз тут я рашыў засяродзіць сваю дзейнасць, да гэтай пары параскіданую па розных гарадах. Мы заснавалі згуртаванне, якое арганізуе „Вэртэп” і іншыя адукацыйна-тэатральныя мерапрыемствы якраз у гэтых пяці мясцовасцях, у якіх гасцяваў „Вэртэп”. Хочам таксама на пастаянна перанесці тэатр „А3” [дзейнічае пры згуртаванні — М. Х.] у Палічную і Кляшчэлі. Яго акцёры паходзяць з розных мясцовасцей, м.інш. з Рацібожа, Познані, Варшавы, Лодзі. Маем намер зрэалізаваць „Сон у летнюю ноч” Уільяма Шэкспіра, у вулічнай версіі, на шэкспіраўскі фестываль, што адбудзецца праз год у Гданьску, а на фестываль „Мальта” — прадстаўленне „Спяваючыя канфесіяналы”, аб гісторыі ўзнікнення свету бачанай рознымі культурамі. Будуць яны, вядома, паказвацца на „Вэртэпе”. Аб'яўлю таксама конкурс на найлепшую батлеечную пастаноўку, якую будзем вазіць пасля па розных мясцовасцях Падляшша. Хачу вярнуць сюды традыцыю гэтага тэатра.

У сваю чаргу Марта Гжымкоўская, каардынатарка па арганізацыйных справах чарговых — VСувальскіх „Тэатр-Акцыяў 2010 — На Усход” — заявіла:

— Ідэя сёлетняй нашай імпрэзы — паказаць культуру Усходняй Еўропы ды адкрываць яе ўплыў на сучаснасць Сувалкаў і Сувальшчыны. Лічу, што Усход гэта не толькі напрамак свету. Гэта таксама напрамак мыслення і спосаб адчування.

Былі ў Сувалках тэатральныя калектывы галоўным чынам з Расіі і Украіны. З Беларусі адрэкамендаваў сябе ўзнагароджваны на еўрапейскіх фестывалях Брэсцкі лялечны тэатр са спектаклем „Халстамер” паводле Льва Талстога. Гэта першая спроба пастаноўкі гэтага аўтара на сцэне лялечнага тэатра. Зайграла таксама „Malanka Orchestra” з Мінска (першы раз у Польшчы). Гэты аркестр з дзесяці асоб захапіў сувальскіх слухачоў сваімі незвычайна энергетычнымі мелодыямі.

Як беластачанін зайздрошчу Палічнай, Кляшчэлям і Сувалкам такіх людзей як Дар'юш Скібінскі ці Марта Гжымкоўская. Перш за ўсё іх уражлівасці і адкрытасці на ўсходнясць, між іншым, на беларушчыну, а перш за ўсё знакамітага распазнання ў тым, што на тамашнім культурным рынку ствараецца ў выданні самай высокай якасці.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

„Званіць, ляцець” у выкананні брэсцкага „Свабоднага тэатра”

ПАДЛЯШСКІ „ВЭРТЭП”

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Ужо другі раз праз падляшскія мясцовасці, у якіх пражываюць у пераважнай большасці беларусы, пракаціліся тэатральныя спектаклі ў рамках Міжнароднага тэатральнага фестывалю „Вэртэп”.

У сёлетнім выпуску гэтай пяцідзённай імпрэзы ў першай дэкадзе жніўня адрэкамендавалася дванаццаць тэатральных груп з Польшчы, Беларусі, Украіны і Даніі. Без сумнення, адной з зорак быў брэсцкі „Свабодны тэатр” і яго вулічны парад „Званіць, ляцець”, у час якога акцёры выступалі на хадулях.

Фестываль у чарговы раз сарганізавала Культурнае згуртаванне „Pocztówka”. Пастаянна дзейнічае яно з 2004 г. у даваенным дряўляным доме ў вёсцы Палічна непадалёк Кляшчэляў. Стварае яго група — як сябе называюць — незалежных творцаў, звязаных галоўным чынам з тэатрам, але таксама з фатаграфіяй і музыкай. „Вэртэп” з’яўляецца яго найважнейшым мерапрыемствам апрача адукацыйнага праекта „Інтэрнэтная тэатральная адукацыя — камунікацыя па-над падзеламі”, накіраванага да падляшскай моладзі.

Першы выпуск „Вэртэпу” адбываўся ў Кляшчэлях, Белавежы і Гайнаўцы. У гэты раз фестывальныя спектаклі дайшлі таксама да Нараўкі і Чаромхі. Плакаты з прапановамі спектакляў віселі амаль у кожнай вёсцы паўднёва-ўсходняй часткі Беласточчыны. „Ніва” правяла адну суботу ў Белавежы, дзе ўдалося фестывалю пагасцяваць галоўным чынам дзякуючы дырэкцыі Белавежскага нацыянальнага парку. Якраз на пляцоўцы каля яго сядзібы ставілася большасць спектакляў, значыць, перад Царскімі варотамі, будынкам Цэнтра прыродазнаўчай адукацыі (найстарэйшы будынак на тэрыторыі пушчы, з 1845 г., былы музей царскіх памятак) і на пляцы перад сядзібай дырэкцыі (таксама ў спецыяльна разбітай юрце). Некаторыя спектаклі паказаны былі ў Белавежскім доме культуры. Па прычыне буры і праліўнога дажджу, на жаль, не дайшло да паказу аднаго з найбольш чаканых спектакляў „Балады аб квадраце” Тэатра мастацтва Мар’яна Бэднарка з Раціборжа. Мела гэта быць забаўная і жывапісная тэатральная прэзентацыя, інспіраваная славутай карцінай „Чорны квадрат” Казіміра Малевіча. Раней іншыя з паказаных тут мерапрыемстваў выклікалі немалое зацікаўленне мясцовага насельніцтва, але большае турыстаў. Агулам белавежскім дарослым і маладым гледачам паказаны былі дзевяць спектакляў (у іншых мясцовасцях ад сямі аж да адзінаццаці ў адзін дзень). Увечары ў аглядзе прадстаўлення ў манеры ценявога тэатра „Генезіс” тэатра Адама Вальнага, выпускніка Мастацкага ліцэя ў Супраслі і факультэта рэжысуры Тэатральнай акадэміі ў Беластоку, не памяшала аматарам тэатра нават музыка, якая далятала сюды з „Ператоча” ў белавежскім амфітэатры. Мабыць, сталася гэта таму, што Адам Вальны, як рэжысёр спектакля, а заадно яго акцёр, з поспехам прыцягваў мастацкай крэацыяй уявы стварэння свету.

Увагу „Нівы” прыцягнулі ў Белавежы асабліва тры спектаклі. Першы з іх гэта „Б 612” Тэатра Дэлікатэс. Гэта свабодная, пантамімна-мастацкая інтэрпрэтацыя „Маленькага прынца” Антуана дэ Сент-Экзюперы ў выкананні варшаўскага артыста Віктара Маліноўскага. Як прызнаецца аўтар, „Б 612”, гэта „спектакль аб падарожжы без мараў” і пытаецца: „Чым ёсць чалавек без мараў? Караблём без стырнавога, які ўсляпую імчыцца да канчыны”. Іншы спектакль, пад якога ўражаннем мы засталіся, меў правакацыйны загаловак „Баба-рыба, інакш кабета па-грэцку”. Паставіў яго мастацкі калектыў „Баба-рыба”, які дзейнічае ў сталіцы. Гэта праект з пагранічча тэатра, з выкарыстаннем цытатаў з творчасці старажытнага грэчаскага драматурга Еўрыпіда, мультымедыйнага мастацтва, песень ды... кулінарнага майстэрства, а гэта таму, што ўвесь гэты фемінісцкі аповед „круціцца” вакол кухні, дзе, м.інш., гатуецца загаловачная рыба, якой, дарэчы, пасля спектакля частуюцца гледачы. Чацвёрка акцёрак выказалася знакамітым вакалам і вялікім акцёрскім патэнцыялам. Можа гэта не здзіўляць, паколькі частка з іх выводзіцца з культавай ужо тэатральнай групы, класіфікаванай як эксперыментальны антрапалагічны тэатр „Гардзеніцы”, які дзейнічаючае ад паловы сямідзесятых гадоў мінулага стагоддзя ў падлюблінскай аднайменнай вёсцы.

У Белавежы да музычна-танцавальнага банкету ў спецыяльна збудаванай па мангольскім узоры юрце заахвочвалі Яцак Галас і „Намады культуры”. Разам з жонкай Аліцыяй, падыгрываючы на інструментах качэўніцкіх музыкантаў і ў такт разнароднай этнічнай музыкі танцаваў у карагодзе з публікай, якой не трэба было спецыяльна заахвочваць да ўдзелу ў гэтым паказе. Яцак Галас увесь час у пошуках слядоў песень вандроўных лірнікаў у запісах этнографаў і ў хатніх архівах.

Найбольш, аднак, захапіў белавежскую публіку ў сваім карагодзе існуючы ад дзевяці гадоў „Свабодны тэатр” з Брэста, для спектакля якога інспірацыяй сталі творчасць Данілы Гармса, нямое кіно ды арыентальны і кірмашны тэатры. Карагод м.інш. з акцёрамі на хадулях, у масках і адмысловых каляровых строях рушыў з-пад брамы БНП. Сярод герояў можна было пазнаць Аляксандра Пушкіна і Мікалая Гогаля. Усё з тэкстамі, выказванымі акцёрамі штохвіліны, але з другарадным значэннем, пры ляскатанні бубноў і жывой рэакцыі

Дар’юш Скібінскі трымаў вока над усім „Вэртэпам”

публікі, да якой што і раз чапляліся мастакі. Акцёры Сяргей (у тэатры ад сямі гадоў) і Святлана (у тэатры ад трох гадоў), у якіх „Ніва” спыталася пра тое, ці шмат падобных вулічна-тэатральных мерапрыемстваў у Беларусі, адказалі:

— Няшмат. У Брэсце Драмтэатр нядаўна паставіў першы такі вулічны спектакль. Чаму мала такіх прадстаўленняў? Можа не ўсім даспадобы вулічная эстэтыка. Такіх фестываляў альтэрнатыўных тэатраў, як „Вэтрэп”, у Беларусі мала, можа тры-чатыры, але не ў такой колькасці, як у Польшчы, паказваных увесь год.

Сяргей дадае:

— Наш тэатр ставіць не толькі вулічныя спектаклі. Даем таксама прадстаўленні ў залах, як у апошні час „Працэс” паводле Франца Кафкі. Залу для паказу нашых спектакляў, у якой праводзяцца таксама канцэрты, а нават дыскатэкі, дае нам брэсцкае аддзяленне культуры. Усё робім самі, таксама самі шыем касцюмы і рыхтуем сцэнічнае афармленне. Сёлета іграем радзей, таму што нашы акцёркі чакаюць дзяцей.

Рэжысёрка „Званіць, ляцець” Аксана Гайко:

— Наш тэатр узнік таму, што нам, групе сяброў [з рознымі прафесіямі, таксама і эканамістаў — М. Х.] хацелася выказвацца праз тэатр. Ніхто з нас не скончыў тэатральных школ. Не здараецца нам, аднак, часта выступаць на вуліцах.

— Чаму?

— ??? Кажуць нам: а нашто вам паказвацца на вуліцы, яна не для таго. Мы ж, калі схочам, можам рэкамендаваць нашы спектаклі ў залах. Як так можна на вуліцы без дайпрычыны біць у бубны? Вулічных тэатраў у Беларусі ніхто не падтрымлівае. Нават афішы з інфармацыяй аб такіх спектаклях не вешаюцца. Гэта, вядома, боязі ўлад чыста палітычнага характару. „Свабодны тэатр” так менавіта называецца, але не з-за свабоды адносна палітыкі. Маем на думцы мастацкую свабоду.

Усё паказвае на тое, што праз год адбудзецца другі выпуск „Вэртэпу” . У размове з „Нівай” бацька і дырэктар фестывалю, а заадно шэф Згуртавання „Pocztówka” Дар’юш Скібінскі сказаў, чаму гэтае мерапрыемства носіць такую назву:

— Гэтая назва перш за ўсё належала батлеечным тэатральным калектывам у час сярэднявечча на ўскраіне Усходу. Батлеечныя тэатры функцыянуюць яшчэ да нашага часу на Украіне, дзейнічае некалькі такіх у Беларусі, затое ў Польшчы іх дзейнасць практычна зусім ужо прапала. Быў гэта від калектываў, рыхтуючых спектаклі пад нейкія рэлігійныя ці свецкія падзеі. Пры нагодзе кожнага свята рыхтавалася такое тэатральнае дзеянне. Да вайны ў Гайнаўцы дзейнічала аж пяць такіх груп, займаючыхся падрыхтоўкай такіх дзеянняў. А паколькі гэта ўжо тут, на гэтым абшары, было, дык варта да гэтага вяртацца, а не выдумляць штосьці іншае. Нашто чарговыя, выдумныя, тэатральныя канфрантацыі, калі гэты від тэатральнага жыцця змяшчаецца ў тутэйшай традыцыі. А апрача таго дарогі і бездарожжы гэтай тэрыторыі шмат каму асацыююцца з „вэртэпамі”.

Чаму на сёлетні „Вэртэп” запрошаны быў „Свабодны тэатр”? Дар’юш Скібінскі тлумачыць коратка:

— Гэта проста дасканалы тэатр. Я бачыў іх на адым з польскіх фестываляў і адразу заззяла мне ў галаве пытанне: а хто гэта такі? Яны паставілі спектакль спецыяльна для „Вэртэпа”, у маім любімым жанры: абсурду і сюррэалізму. У тэатры выступаюць маладыя і вельмі таленавітыя людзі.

Сёлетні „Вэтрэп” мог быць праведзены м.інш. дзякуючы падтрымцы Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны ды падляшскага і гмінных самаўрадаў.

Гайнаўка

Рухомы пункт інфармацыі

Традыцыйна гайнаўская паліцыя ў час летніх канікул арганізуе для жыхароў горада і Гайнаўскага павета рухомыя пункты інфармацыі. Зацікаўленыя асобы, апрача інфармацыі аб дзейнасці паліцыі, маюць магчымасць зрабіць у такім пункце маркіроўку ідэнтыфікацыйнымі знакамі такіх каштоўных прадметаў як рэчы, фотаапараты, сотавыя тэлефоны, фотакамеры і г.д. пры дапамозе тайнапісу (нябачнага простым вокам тушу). Такія пункты працуюць з 10 да 13 гадзіны па:

— панядзелках — пры Управе горада,

— аўторках — пры маркеце „Каўфланд",

— серадах — каля рынку „Макс",

— чацвяргах — пры краме „Аргелан" па вуліцы Ліпавай,

— пятніцах — пры Водным парку.

Асобы, якія рашыліся абазначыць сваю маёмасць, павінны прад'явіць пашпарт і дакумент уласнасці прадмета (рахунак, чэк і г.д.). Маркіроўка праводзіцца бясплатна.

Гайнаўка

Свята паліцыі

16 ліпеня 2010 г. у Павятовай камендатуры Паліцыі ў Гайнаўцы адбылося мерапрыемства з нагоды 91-гадовага юбілею польскай паліцыі. У святкаваннях удзельнічалі ваяводскі камендант Паліцыі ў Беластоку, прадстаўнікі мясцовых самаўрадаў, улад горада, суда і пракуратуры, супрацоўнічаючых з паліцыяй мундзірных служб, а таксама сябры. Мерапрыемства пачалося з супольнай малітвы ў прысутнасці святароў, затым адбылася ўрачыстасць прысваення чарговых службовых званняў 36 функцыянерам паліцыі — 18 аспірантам і 18 падафіцэрам.

(ус)

Нараўчанская гміна

У Новым Ляўкове найбольш чытачоў „Нівы"

У Нараўчанскай гміне (Гайнаўскі павет) трыццаты нумар „Нівы" чыталі 53 асобы. А найбольш іх у Новым Ляўкове — 26 (!), у Старым Ляўкове — 8, у Плянце і Нараўцы — па 6. Па 1-2 чытачы было ў Альхоўцы, Семяноўцы, Свінароях, Падляўкове і ў Лешуках.

У гэтым нумары нашага роднага часопіса нараўчанскія падпісчыкі і чытачы звярнулі асаблівую ўвагу на фотарэпартажы пра „Басовішча — 2010" Ілоны Карпюк, „След любоўнай трагедыі" Аляксандра Вярбіцкага і „Падводную лонку" Міры Лукшы, а таксама допіс „Як аднойчы кракадзіл у Белавежу прыплыў" Пятра Байко.

Кніжкі пад загалоўкам „Віры" Георгія Валкавыцкага атрымалі верныя чытачы Яўгенія і Яўген Смольскія ды Юрка і Галіна Казлоўскія з Новага Ляўкова, таксама Уладзімір Клімюк з Плянты і Вера Осяк з Падляўкова. „Віры" перадаў ім ад „Нівы" аўтар гэтага допісу.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Свята ў Койлах

У новых касцюмах выступілі „Чыжавяне"

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Койлы — велікаватая вёска з якаснымі землямі і сельскагаспадарчымі традыцыямі ў галіне вырошчвання збожжа і жывёлагадоўлі. Так, як і ва ўсёй Чыжоўскай гміне, захавалася тут моцная беларуская нацыянальная свядомасць, што пацвердзілі жыхары Койлаў у час апошняга перапісу насельніцтва. Культурнае жыццё сяла ў мінулым гуртавалася вакол школы, дзейнасць якой была спынена яшчэ ў сямідзесятых гадах. З гэтай пары месцам сустрэч і вясковых сходаў стаў клуб. Паколькі ў вёсцы даўнавата былі арганізаваны мерапрыемствы з удзелам беларускіх калектываў, жыхары Койлаў з радасцю ўспрынялі інфармацыю, што 8 жніўня ладзіцца ў іх беларускі фэст.

На танцавальнай пляцоўцы за клубам сабраліся вяскоўцы і іх дзеці, што зараз жывуць у Гайнаўцы ці Беластоку ды жыхары суседніх сёл. Сядзячых месцаў хапіла толькі найстарэйшым і наймалодшым, астатнія стоячы слухалі меладычныя беларускія песні, гумарыстычныя дыялогі. Публіка мела нагоду паслухаць неапрацаваныя фальклорныя творы ў выкананні „Жэмэрвы" і „Збучанак". З гумарыстычнымі сцэнкамі выступілі гайнаўскія белліцэісты з музейнага тэатральнага калектыву „Сявенька", якія прыехалі са сваім апекуном Янам Карчэўскім. Удала выступілі тры калектывы з Чыжоўскай гміны — „Чыжавяне", „Збучанкі" і „Незабудкі" з Курашава. З цікавай інтэрпрэтацыяй нашых песень выступіў калектыў „Луна" з Парцава.

— Ужо ў мінулым годзе была прапанова арганізаваць у Койлах беларускі фэст, але мы хацелі спачатку адрамантаваць вясковы клуб і толькі пасля ладзіць мерапрыемствы, — заявіў войт Чыжоўскай гміны Юрый Васілюк.

Сапраўды, як у сярэдзіне, так і звонку адрамантаваны клуб уражвае эстэтыкай і практычнасцю.

— Клубам будуць карыстацца мясцовыя жыхары пры розных патрэбах. Ужо ладзілі тут хаўтуры. Будуць тут таксама адбывацца вясковыя сходы і іншыя грамадскія сустрэчы, — тлумачыў войт Васілюк. — Прыгожым будынкам захапляюцца жыхары іншых сёл. Жыхары Курашава ўжо хочуць, каб у іх клубе таксама пакласці тэрмаізаляцыю і зрабіць прыгожую элевацыю, бо ўсярэдзіне клуб ужо адрамантаваны. На рамонт і на беларускі фэст у Койлах мы атрымалі дафінансаванне з еўрасаюзных сродкаў. Большасць сельскіх святліц мы рамантуем за нашы гмінныя сродкі і таму рамонтныя работы растэрміноўваем. Напрыклад, нядаўна рамантавалі мы звонку клуб у Кленіках, а ўсярэдзіне святліцу ў Шастакове. Восенню гэтага года плануем ладзіць таксама мерапрыемства ў Шастакове ў рамках Асенніх сустрэч з фальклорам і калі б тады было дрэннае надвор'е, можам перанесці імпрэзу ў клуб. У наступным годзе хочам ладзіць беларускі фэст у Камені, дзе такога хіба ўвогуле раней не было.

Беларускі фэст у Койлах — вынік супрацоўніцтва Гміннага асяродка культуры і Гміннай управы ў Чыжах з Музеем і асяродкам беларускай культуры ў Гайнаўцы. Над сцэнай луналі два лозунгі: „І тут жывуць людзі" ды „І Сустрэчы з фальклорам рэгіёна Белавежскай пушчы". Гэтыя два праекты склалі адно — беларускі фэст. ГАК у Чыжах атрымаў еўрасаюзныя сродкі на імпрэзу ў рамках Праграмы развіцця вясковых тэрыторый „Лідар плюс" і з праекта „Мясцовай групы дзейнасці". Беларускі музей з Гайнаўкі карыстаўся падтрымкай МУСіА для сваіх фэстаў з цыкла „І тут жывуць людзі". Мерапрыемства ўспамагалася яшчэ гміннымі сродкамі. Музей далучыўся да гміннага мерапрыемства і стаў яго раўнапраўным суарганізатарам, бо ўжо з мінулага года рыхтаваўся ладзіць у Койлах беларускае мерапрыемства.

— Будынак цяперашняга клуба будаваўся яшчэ пры санацыі для патрэб школы. Вучыліся тут дзеці з Койлаў, Асоўкі і тыя з Курашава, што жылі непадалёк ад нашага сяла. У час вайны я і іншыя вучыліся тут па-беларуску, а калі была ліквідавана ў нас школа, будынак сталі выкарыстоўваць у якасці святліцы. Рамантавалася яна хіба ўжо з пяць разоў. Аднак цяперашні рамонт — самы грунтоўны. Спачатку перакрылі дах, а пасля ўзяліся за рамонт усярэдзіне і звонку. Павырывалі старую падлогу, навезлі ўсярэдзіну зямлі, утрамбавалі яе, каб пасля пакласці плітку, — расказваў койлаўскі старажыл, які жыве насупраць клуба і меў магчымасць назіраць за рамонтнымі работамі. — Аднак маладых, якія часцей маглі б карыстацца клубам, у нас мала. У многіх хатах жывуць па двое старэйшых людзей, так як мы, або адзінокія.

— Гаспадароў апошнім часам стала яшчэ больш чым было дагэтуль, бо бацькі параспісвалі свае ўчасткі на паасобных дзяцей, што жывуць у гарадах. Са звыш васьмісот гетараў койлаўскіх палёў многа абрабляе Ялоза са Старога Беразова, ёсць некалькі буйных гаспадароў. Частка старэйшых людзей таксама корпаецца яшчэ на сваіх участках, — тлумачыў іншы старэйшы мужчына.

Мае суразмоўцы станоўча ацанілі рамонт клуба, але на іх тварах і ў выказваннях відаць было, што не цешаць ужо іх ні музыка, ні тэхнічны прагрэс. Думаю, што ў размове ахвотна вярнуліся б у часы сваёй маладосці, калі пасля вайны ў Койлах было многа моладзі і ладзіла яна танцы па-свойму.

З беларускім рэпертуарам выступілі таксама маладзёжныя калектывы, „Metro" з Гайнаўкі, у якім запрэзентаваліся выпускнікі белліцэя, „Dekada Band" з Бельска-Падляшскага, „Art-Pronar" і „Be Happy" з Нарвы. Апошні падыгрываў таксама да танцаў. На прыкладзе названых калектываў відаць, што на Гайнаўшчыне, Бельшчыне і не толькі тут гурты, якія выступаюць з беларускім рэпертуарам, прымаюць польскія і англійскай назвы, што хіба з'яўляецца агульнапольскай з'явай. Добра, што ў вялікай ступені ўжо польскамоўная моладзь хоча развучваць беларускі рэпертуар і выступаць з ім на сцэне. Беларускі характар мерапрыемства падтрымлівала таксама беларуская літаратура, якую можна купіць у час музейных фэстаў. Ларок, які абслугоўваюць працаўнікі і валанцёры беларускага музея, прапануе не толькі літаратуру на беларускай мове, але і польскія кніжкі на тэму нашага рэгіёна.

Усіх выканаўцаў койлаўская публіка ўспрымала гарачымі апладысментамі

— Прадаем, між іншым, кніжкі айца Рыгора Сасны і матушкі Антаніны Троц-Сасны. Найчасцей купляюць іх людзі, што жывуць на Гайнаўшчыне або Бельшчыне, і тыя, што перасяліліся адтуль у гарады. Аднак з продажам кніжак бывае па-рознаму, напрыклад, сёння купілі ў нас усе экземпляры „Евангелля" на беларускай мове, выдадзенага „Братчыкам", — тлумачыў выконваючы абавязкі дырэктара Беларускага музея Тамаш Ціханюк (ад старшыні Музея і асяродка беларускай культуры Міраслава Морданя даведаўся я, што конкурс на пасаду дырэктара музея будзе аб'яўлены пасля канікулаў і перыяду адпускоў). На фэсце бацькі куплялі сваім дзеткам не толькі марожанае і цацкі, але таксама і кніжачкі для размалёўвання, якія прадаваліся з беларускай літаратурай.

Скарбы

АРХІЎ ЖЫРОВІЦКАГА МАНАСТЫРА БЫЎ ВЫВЕЗЕНЫ Ў НОВАСІБІРСК

Сяргей ЧЫГРЫН

Доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс неяк сказаў, што Беларусь з'яўляецца адзінай краінай у свеце, краінай-выключэннем, дзе нацыянальных культурных скарбаў, матэрыяльных і духоўных, на радзіме меней, чым за яе межамі. І з ім можна пагадзіцца, бо прычынай гэтаму найперш былі розныя войны, якія праходзілі праз Беларусь. Падчас гэтых войнаў рабавалася наша Беларусь, наша зямля. Тысячы каштоўных дакументаў, абразоў, крыжоў, посуду, вырабаў з золата і срэбра, кніг зніклі з Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра за 540 гадоў яго існавання. Аб гэтым нядаўна пагутарыў наш карэспандэнт з галоўным архівістам і летапісцам Жыровіцкага праваслаўнага манастыра іераманахам Агапіем (Голубам).

— *Айцец Агапій, калі найбольш было ўкрадзена і вывезена каштоўнасцей з Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра?*

— Найбольш каштоўнасцей было вывезена падчас Першай сусветнай вайны ў Расію. Адны з іх трапілі ў архівы і бібліятэкі Новасібірска, іншыя — у горад Новакузнецк. Але дасканала ўсім гэтым пакуль ніхто не займаўся. Праўда, семінарысты і студэнты Мінскіх духоўнай семінарыі і акадэміі ў Жыровічах у апошнія гады ўжо пачалі даследаваць гэтую тэму і нават сёння пішуць навуковыя працы.

— *Згадайце, калі ласка, што даследуюць студэнты па гэтай тэме?*

— Напрыклад, Аляксандр Папоў даследаваў і напісаў дысертацыю на тэму „Нарысы гісторыі бібліятэкі Жыровіцкага манастыра". Аляксей Кулін апісаў дзейнасць архіва сённяшняга Жыровіцкага манастыра. Але ён заглянуў і ў мінулае, асабліва ў міжваенны архіў манастыра і добра ўсё апісаў. Свяшчэннік Мікалай Анікееў напісаў вялікую працу пра архімандрыта Антонія Мельнікава, які пры жыцці даследаваў Жыровіцкі манастыр і выдаў, надрукаваны на машынцы, трохтомнік пра Жыровіцкі манастыр у гісторыі заходнерускіх епархій. Там шмат радкоў адрасаваных каштоўнасцям Жыровіцкага Свята-Успенскага манастыра. Адзін том сваёй працы Мікалай Анікееў прысвяціў жыццю і дзейнасці Мельнікава, а 5 тамоў архіву Мельнікава, які збіраў матэрыялы па ўсім свеце пра Жыровічы. Там ёсць згадка і пра архіў манастыра, дзе згадваецца, што ён быў вывезены ў Новасібірск і Новарасійск. А што не змаглі вывесці, закапалі. Але тыя дакументы ў зямлі прапалі.

— *Жыровіцкія дакументы, як мне вядома, захоўваюцца ў бібліятэках і архівах не толькі ў Расіі?*

— Вядома. Яны захоўваюцца ў Львове, Вільні, Санкт-Пецярбургу, Варшаве, Маскве, але толькі не ў Жыровічах. Напрыклад, у архіве Санкт-Пецярбургскага аддзялення Інстытута гісторыі Расійскай акадэміі навук сёння шмат цікавых дакументаў, якія маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі Жыровіч. У фондзе былога прафесара Жыровіцкай духоўнай семінарыі Пракопа Нілавіча Дабрахотава (Максімава) значацца 2 492 адзінкі захавання збораў на польскай, лацінскай

і старабеларускай мовах. Гэтыя сабраныя рарытэты Дабрахотаў вывез з Жыровіч яшчэ ў 1845 годзе. Найперш гэта дэкрэт Слонімскага земскага суда па справе паміж Іванам Мялешкам і Данілам Солтанам за Жыровічы 1609 года; выпіс са слонімскіх земскіх кніг запісу Івана Аляксандравіча Солтана аб перадачы маёнтка Жыровічы сваёй жонцы ад 20.09.1572 года; пасланне кіеўскага ўніяцкага мітрапаліта Антонія Сялявы да Жыровіцкага суперыёра Канстанціна Вітапольскага ад 23.06.1653 года; спіс вучняў Жыровіцкай школы XVIII стагоддзя; зборнік гістарычных звестак пра Жыровіцкі манастыр з апавяданняў і спраў старых людзей, што заслугоўваюць даверу, склаў Антоній Завадскі, 1713 год; кніга найдаўнейшых цудаў абраза Жыровіцкай Маці Божай XVII стагоддзя; акт продажу Данілам Солтанам маёнтка Жыровічы з прысёлкамі літоўскаму канцлеру Льву Сапегу ад 06.07.1621 года; вопісы Жыровіцкага манастыра — 1753, 1778, 1785, 1800 гадоў і іншыя. Там захоўваюцца таксама пратаколы Жыровіцкай генеральнай кангрэгацыі айцоў базыльянаў 1792 года; нумары штодзённага часопіса суперыёраў Жыровіцкага манастыра 1772-1786 гадоў; заўвагі Паўла Дабрахотава з гісторыі Брацтва пры Жыровіцкім абразе Маці Божай 1837-1863 гадоў, і дзесяткі іншых каштоўнасцей.

У архіве Санкт-Пецярбургскага аддзялення захоўваюцца і копіі дакументаў пра мястэчка Жыровічы, зборнік гістарычных звестак пра Жыровічы 1713 года, апісанне Жыровіцкага манастыра ў 1713 годзе, панегірык шведскаму каралю Густаву Адольфу на лацінскай мове, складзены ў Жыровічах, а таксама зборнікі Антонія Завадскага, дзе маецца шмат звестак пра Жыровічы і суседні з Жыровічамі Быцень.

— *Ведаю яшчэ, што беларускія літаратуразнаўцы і гісторыкі Адам Мальдзіс і Язэп Янушкевіч выявілі ў аддзеле рукапісаў фонду базыльянскіх манастыроў навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Украіны ў Львове матэрыялы на польскай мове пра апісанне цудаў у Жыровічах 1758 года, апісанне цудаў у манастырскай царкве ў Жыровічах 1620-1756 гадоў. А ў Нацыянальным дзяржаўным гістарычным архіве ў Львове гэтымі навукоўцамі знойдзены звесткі пра гісторыю царквы ў Слоніме, выяўлены кніга ўліку прыхаджан, якія спавядаліся ў царкве ў Жыровічах у 1791-1800 гадах, звесткі пра маёмасць манастыроў у Быцені і Жыровічах, матэрыялы базыльянскага манастыра ў Жыровічах, справаздача аб праверцы бібліятэкі Жыровіцкага вучылішча ў XIXстагоддзі, справа аб папаўненні бібліятэкі ў Жыровічах (XIX ст.) і справа пра ўніяцкія кнігі, канфіскаваныя ў Жыровічах і гэты спіс можна працягваць. А ці хто займаецца вяртаннем дакументаў і каштоўнасцей Жыровіцкага манастыра на Беларусь?*

— Гэтыя ўсе каштоўнасці з'яўляюцца ўжо ўласнасцю тых дзяржаў, дзе яны знаходзяцца. І ніхто іх нам аддаваць не будзе. А рабіць ксеракопіі дакументаў — даволі дорага. Хаця б з імі азнаёміцца.

— *Айцец Агапій, у Жыровічах шмат бывае гасцей, у тым ліку вялікіх чыноўнікаў з іншых краін свету. Можа хто-небудзь з іх прывёз у падарунак вывезены раней скарб з Жыровіцкага манастыра?*

— Я такога выпадку не памятаю. Адзінае, што было зроблена, дык неяк прывезлі і падаравалі нам факсімільнае „Жыровіцкае Евангелле" XVI стагоддзя, арыгінал якога знаходзіцца ў Вільні. Хачу сказаць, што з Вільняй у нас большменш добрыя стасункі, а вось з Санкт-Пецярбургам — цяжкавата.

— *Пры Мінскай духоўнай акадэміі ў Жыровічах існуе царкоўна-археалагічны кабінет, дзе захоўваецца шмат рарытэтных выданняў. Што гэта за выданні?*

— Любы чалавек можа наведаць гэты кабінет. Ідэя стварэння акадэмічнага музея-кабінета належыць протаіерэю Аляксандру Балоннікаву. Сярод экспанатаў там ёсць рукапісны Псалтыр пачатку XVIII стагоддзя, Службоўнік свяціцеля Пятра Магілы (Львоў 1639), Трэбнік (Львоў 1668), Актоіх (Масква 1638), Апостал з гравюрамі Івана Зубава (1738), Concordia (1677), Апостал дыякана Івана Фёдарава (Львоў 1573), Самавучыцель царкоўных спеваў Аляксандра Кастальскага з аўтографам знакамітага кампазітара (Масква 1909), Катэхізіс, выдадзены ў Лейпцыгу на грэчаскай мове ў 1563 годзе і іншыя. Так што не ўсё яшчэ страчана.

Мелас геніяльнай паэзіі

Адной з найвялікшых постацей беларускай паэзіі XX стагоддзя адмыслоўцы і чытачы называюць Ларысу Геніюш, якая пражыла пакутлівае, але змястоўнае і доўгае жыццё, павучальнае для наступных пакаленняў. Сёлета, 9 жніўня, гэтай легендарнай асобе, мужнай захавальніцы таямнічага архіва БНР ды не

менш таемных нотак беларускага меласу ў сучасных рыфмах, споўнілася 100 гадоў, таму ўвесь 2010 год пазначаны каскадам памятных мерапрыемстваў, праводжаных лідэрамі беларускай інтэлігенцыі і грамадскімі арганізацыямі краіны.

Музычна-выдавецкі лэйбл «БМАgroup», напрыклад, выдаў ажно два юбілейныя выданні на каларытных кампакт-дысках — альбом беластоцкага гурту «Белы сон», творчасць якога прасякнута жывым духам геніяльнай паэзіі, і паўторны тыраж CD-трыб'юта «Жыць для Беларусі», дзе не толькі гучыць жывы голас паэткі, але і цудоўныя песні паводле ейных вялікіх вершаў ад Уладзіміра Мулявіна, Андрэя Плясанава, Алеся Камоцкага, Вальжыны Цярэшчанкі, Зміцера Бартосіка, Віктара Шалкевіча, Ларысы Сімаковіч ды іншых знакамітых артыстаў. Вабным дадаткам да праграмы абодвух дыскаў сталі і мультымедыйныя бонусы, дзе ўтрымліваюцца гістарычныя запісы з прыватных архіваў, юбілейныя сучасныя відэакліпы. Першая прэзентацыя абодвух музычных выданняў адбылася 7 жніўня ў Зэльве.

У верасні запланаваны вялікі канцэрт у сталіцы, прысвечаны Ларысе Геніюш, у якім возьмуць удзел стваральнікі абодвух музычных праектаў і выдаўцы.

Вітаўт МАРТЫНЕНКА, музычны крытык.

Нараўчанская гміна

Прызабыты кавалак

Ёсць такая дарога-гравійка. Вядзе яна ад ваяводскай шашы Юшкаў-Груд — Бандары — Новае Ляўкова — Нараўка ў Лешукі (Нараўчанская гміна) першнаперш цераз лес. На 3-кіламетравым адрэзку гэтая дарога ўхабістая. Пасля дажджу ў выбоінах стаіць вада.

Ехаў я гэтай дарогай у жніўні і ўбачыў, што яна становіцца вужэйшай і вужэйшай — абочыны зараслі густым кустоўем. Кусты значна абмяжоўваюць відавочнасць асабліва на паваротах і робяць дарогу надта небяспечнай.

Дарожныя асцерагальныя знакі (яны яшчэ на тоўстых бетонных слупах) паржавелі і фарба на іх палушчылася і зараз невядома ад чаго яны асцерагаюць.

На прызабытую дарогу неабходна паслаць грэйдэр, каб выраўняць маставую. На ёй даволі вялікі рух легкавых машын, грузавікоў і трактароў. **(яц)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Чаму ў слоніка доўгі нос

(паводле Рэд'ярда Кіплінга)

Гэта толькі цяпер у слана ёсць хобат. А раней, даўным-даўно, ніякага хобата ў слана не было. А быў толькі нос велічынёю з чаравік. Гэты нос матляўся ва ўсе бакі і толькі перашкаджаў слану.

І вось з такім вялікім носам, як чаравік, жыў у Афрыцы каля рэчкі Лімпапо маленькі Слонік. Ён быў вельмі цікаўны, усё хацеў ведаць і ўсюды соваў свой нос.

У сваёй цёткі Страўсіхі ён пытаўся, чаму ў яе такія кароткія крылы, у дзядзькі Жырафа — чаму ў яго такая доўгая шыя, у сваёй другой цёткі, Бегемоціхі, ён пытаўся, чаму яна такая тоўстая, у дзядзькі Павіяна — чаму ён такі валасаты.

Слонікавы дзядзькі і цёткі злавалі на яго, гэтага назолу і прыставалу, і давалі яму хто кухталя, хто грымака...

Але гэтыя кухталі і грымакі не адбівалі цікаўнасці ў Слоніка: ён усё абнюхваў, абмацваў і пытаўся: «А чаму так?»

І вось аднойчы захацелася Слоніку даведацца, што есць на абед Кракадзіл. Ён запытаўся: «Дзядзька Павіян, цётка Страўсіха, ці ведаеце вы, што есць на абед Кракадзіл?»

— Ц-ш-ш-ш! — зашапталі ўсе дзядзькі і цёткі і зноў пачалі лупцаваць Слоніка, гэтага назолу і прыставалу.

Пабег Слонік да мудрай птушкі Калаколы і пытаецца: «Цётка Калакола, ці ведаеце вы, што есць на абед Кракадзіл?» І сказала яму птушка Калакола: «Бяжы да берага соннай, зялёнай ракі Лімпапо, там у зялёнай вадзе і жыве Кракадзіл. Ён табе сам скажа...»

«Бывайце! — сказаў Слонік сваім дзядзькам і цёткам. — Я іду да соннай, зялёнай ракі Лімпапо. Так мне сказала мудрая птушка Калакола. Я сам запытаю Кракадзіла, што ён есць на абед».

І вось ідзе Слонік дзень, ідзе два, ідзе праз лес, ідзе праз горы і нарэшце бачыць зялёную, мутную, сонную раку Лімпапо. Каля соннай ракі бачыць Слонік

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

шмат звяроў. Падышоў Слонік бліжэй. Бачыць: усе звяры спяць. Штурхануў Слонік сваім вялікім, як чаравік, носам Змея, разбудзіў і пытаецца: «Скажыце, калі ласка, дзе тут жыве Кракадзіл?» Раззлаваўся Змей, бо вельмі хацеў спаць, ды як дасць хвастом Слоніку па носе. «І тут б'юцца!» — пакрыўдзіўся Слонік. Не можа даць рады, да каго падысці, бо не ведае, як выглядае Кракадзіл.

Пайшоў Слонік прэч ад Змея. Змей абкруціўся каля дрэва і зноў заснуў.

Ішоў-ішоў Слонік уздоўж рэчкі Лімпапо, стаміўся, захацеў адпачыць. убачыў вялізнае бервяно, што тырчала з вады і даставала да пясочку на беразе. Сеў Слонік на бервяно, а яно заварушылася, міргнула адным вокам, міргнула другім. Не ведаў Слонік, што гэтае доўгае зялёнае бервяно — Кракадзіл. «Скажыце, калі ласка, ці не ведаеце вы, дзе тут жыве Кракадзіл?» — запытаў Слонік у бервяна з вачамі.

Падміргнуў Кракадзіл Слоніку і сказаў: «Падыдзі бліжэй, мой маленькі, я і ёсць Кракадзіл. Паглядзі, як я плачу сваімі Кракадзілавымі слязьмі!» Узрадаваўся Слонік: «Я вас даўно шукаю! Скажыце, калі ласка, што вы ясце на абед?» — «Падыдзі яшчэ бліжэй, я табе скажу на вуха!» Нахіліў Слонік галаву да Кракадзілавай пашчы, а той — цап яго за нос! «Вось мне здаецца, — сказаў Кракадзіл, — што я сёння на абед буду есці сланяціну».

«Бузьдзіце бядзе, бдзе ведзьбі бадзіць!» (пус-ціце мяне, мне вельмі баліць!) — пачаў прасіцца Слонік і ўпірацца ўсімі чатырма нагамі. Слонік цягне сабе, а Кракадзіл сабе. Пачуў крык Змей, стала яму шкада Слоніка, абкруціўся Змей вакол ягонай задняй нагі і пацягнуў Слоніка назад. Кракадзіл і выпусціў Слонікаў нос, плюхнуўся ў рэчку — толькі пырскі ва ўсе бакі!

Паваліўся Слонік на пясок, ад болю аж вочы заплюшчыў, кажа: «Дзякуй табе, дзядзька Змей!»

Расплюшчыў вочы, глядзіць, а нос яго стаў доўгі-доўгі, аж да самай зямлі!

Заплакаў Слонік: «Як жа мне жыць з такім носам!»

«Не плач! — супакоіў яго Змей. — Ты ўбачыш, што твой новы, доўгі нос яшчэ

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

лепшы за той стары, нязграбны, як чаравік. Супакойся, а я пайду яшчэ пасплю».

Змей пайшоў да свайго дрэва і пакінуў Слоніка аднаго. Слонік плакаў-плакаў, стаміўся і заснуў. Але вось пралятала міма муха і балюча ўкусіла Слоніка за спіну. Раззлаваўся Слонік, стукнуў муху сваім доўгім носам і забіў яе. Глянуў Слонік угару, убачыў спелыя сакавітыя бананы, схапіў іх сваім доўгім носам і з'еў, апусціў у рэчку свой доўгі нос і напіўся вады, ды яшчэ сам сабе дожджык зрабіў. Узрадаваўся Слонік, заспяваў песеньку і пабег дадому.З таго часу ўсе з павагай глядзелі на доўгі нос Слоніка і пачалі называць яго хобат. А калі хто Слоніка крыўдзіў, то ён мог сам даць каму кухталя, а каму грымака.

Але Слонік быў добры, ён усім дапамагаў сваім моцным хобатам і сам нікога не крыўдзіў.

Вершы Міры Лукшы

Зося

Зося моркву пасадзіла
ў агародзе ў бабкі Ядзі.
Морква ёй расце, аж міла:
вылезла ўжо на паўпядзі,
ды, бо сеяла з насення,
тут зялёная чупрынка, —
дзе ж у морквачкі карэнне?
Хвосцік... бледнай павуцінкай?!
Морквы ж корань — ледзь угрызешся!
Вырас толькі гэткі хвосцік?!
Дзе ж ты плёну набярэшся!..
Ды яшчэ ў зямлі схаваны!
Плён багаты будзе ўвосень!
Не рві, Зося, плён зарана!
Потым скажаш, ці ўдалося
гаспадаранне на градках,
як у руплівай гаспадынькі
усё збярэцца па парадку.

Асталіся ў сэрцы і думках

Яўгенія Казлоўская і Магдалена Панасюк

Фота Міры ЛУКШЫ

Ідзем па пясчанай дарозе, у сонечны дзень, па хутары Лазовае за Новым Ляўковам. Ад вайны прайшло ўжо 65 гадоў.

— Цікава ці яна нам штось раскажа? — падумала ўголас Наталля.

Мы дамовіліся на сустрэчу з маці ўласніка агратурыстычнага пансіяната Бора-Здруй. Яўгенія Казлоўская нарадзілася ў 1937 годзе ў Ляўкове. Яна перажыла вайну будучы дзіцём. Гэтая пажылая бабуля са спакойнай усмешкай на твары запрашае нас у сваю хатку і пачынае расказ. Вайна — гэта тэма, якая заўсёды мяне цікавіла. Што тады рабілі людзі? Як ім жылося? Ці баяліся? Усе ведаюць прычыну і вынікі вайны. Мы на ўроках гісторыі не раз гаварылі, чыталі. Але той, хто яе сам не перажыў, не ведае як было сапраўды!

— Калі мне было 6 гадоў, вывезлі нас у Беласток. Мой бацька працаваў у кузні ў *Германіі*. Аднойчы мае бацькі сказалі, каб апранацца, таму што будзе трывога. На небе лёталі самалёты з белымі паясамі. Гэта знак, што напэўна будзе бамбардзіроўка. Ніхто з людзей не чакаў. Усе пагасілі агонь у лямпах і беглі ў лес, — пачала спадарыня Яўгенія.

Усе ведаюць, што ў час вайны не было лёгка. Трэба было хавацца ад фашыстаў. Стралялі, збівалі, высылалі ў канцлагеры і на прымусовыя работы.

— Блізка нас жыла сям'я, бацькі і трое дзяцей, — успамінае бабуля. — Калі немцы прыехалі ў вёску, без ніякіх пытанняў забралі мужчыну і паехалі. Іх не цікавіла, што дзеці засталіся без бацькі. Пад канец вайны немцы ўжо не забівалі, але людзі паміралі ад жахаў і стомы. Усе галадалі. Найбольш не хапала солі.

У нас, у Беластоку, была такая фабрыка і там стаяла салоная вада. Калі людзі даведаліся пра гэта, адразу кінуліся, каб узяць сабе хоць крыху гэтай вады. Пасля яе дадавалі да прадуктаў. Калі я вярнулася ў родную вёску, вобраз быў страшэнны. Усё згарэла. Нашу вёску пацыфікавалі ў 1943 годзе. Асталіся пустыя палеткі, на якіх не было ні адной каровы, ні каня.

Кажуць, што ад вайны нічога не асталося. Не. Асталіся ўспаміны, перажыванні. Яны жывуць у галаве і сэрцы да канца жыцця чалавека, які перажыў такое няшчасце. Бабуля Жэня выцірае свой паморшчаны трар спрацаванай далонню і задумваецца.

„*Пружына*", **Магдалена Панасюк** — II клас Белгімназіі ў Гайнаўцы; супрацоўніцтва: **Наталля Паплаўская** — ПШ у Залуках і **Патрыцыя Нармантовіч** — ПШ у Бабіках

Дарагая Оля!

У першую чаргу вельмі сардэчна цябе вітаю і пытаю як тваё здароўе.

У нас цяпер журналісцкія майстар-класы. Заняткі вядуцца на беларускай мове. Мы жывем у пансіянаце Бора-Здруй у Новым Ляўкове і тут вельмі цікава і прыгожа. За пансіянатам знаходзіцца стадола, у якой стаіць старая хатка, на ўзор тых, якія калісь будавалі і ў якіх жылі нашы людзі. Усярэдзіне — рэчы, якія нашы бабулі і дзядулі выкарыстоўвалі ў штодзённым жыцці. Нас падзялілі на дзве рэдакцыі. Наша задача — сабраць матэрыял, напісаць рэпартажы і скласці газеты. Мы сустракаемся з цікавымі людзьмі, праводзім з імі інтэрв'ю. На канец спадарыня Ганна Кандрацюк-Свярубская (яна нас вучыць пісаць рэпартаж) скажа, каторая газета лепшая.

Яшчэ раз шлю табе прывітанні і жадаю поспехаў у школе!

Твая сяброўка Сара

„*Пружына*", **Сара Кос**, II клас Гімназіі ў Нарве

Музыка з кайфам

Вожык выходзіць з ценю

Вожык — вельмі таямнічая і сімпатычная жывінка. Перабірае нагамі памалу, нешта на плячах нясе, калі небяспека — згортваецца ў калючы клубок. Мала хто ведае, што расслаўленае кінафільмам „Дзень сурка" (па-польску *Dzień świstaka*) свята, даўным даўно было проста Днём вожыка. Легенда пра сурка і яго цень таксама прыналежыць вожыку. Калі разбуджаны ранняю вясною вожык выгляне з норкі і пабачыць свой цень, зразу хаваецца, бо гэта абазначае, што вясна будзе позняя і халодная. Калі ценю не відаць, то неўзабаве надыдзе цёплая вясна. Нягледзячы на пару года, у Беларусі з норкі выходзяць іншыя вожыкі. Найбольш папулярны з іх гэта рэпер Вожык, які сёлета ўдзельнічаў у конкурснай частцы фестывалю „Басовішча".

Хаця без перамогі на „Басовішчы", Вожык быў вельмі задаволены з візіту ў Польшчу. Не толькі выступ на сцэне, але і кантакт з людзьмі, слухачамі мае для яго вялікае значэнне. Калі гаварыць з Вожыкам пра яго творчасць, заўсёды падкрэслівае, што кантакт з публікай самы важны. Вожык ужо даволі вядомы на беларускай сцэне, але часта яго постаць асацыюецца з гуртом „ТА Лапата". Не без прычыны. З „Deecham", „Сінбадам" і „Mono" працуе ён з 2004 года. Што цікава, сам Вожык не жыве ў цэнтры сусвету (чытай: у Менску), толькі ў невялікай мясцовасці Віцебскай вобласці. Адтуль кіруе сваёй кар'ерай, бо з маленькім Сянном ён звязаны не толькі эмацыянальна, але яшчэ ў яго там праца (ён — штатны настаўнік гісторыі). Як сам кажа, свядомасць гісторыі і разуменне складанасцей беларускай тоеснасці з'яўляецца для яго вялікай дапамогай у творчай працы. Ён вельмі прывязаны да беларускай мовы і культуры і тыя вартасці перадае сваім слухачам. На сённяшні дзень можа пахваліцца поспехамі на айчынных рэп-фестывалях, супрацоўнічае таксама з амерыканскім рэп-андэрграўндам, пакуль у якасці каманды „Wu-Tang Fam". Перад Вожыкам напэўна яшчэ адкрыюцца не адны дзверы і разам з іншымі беларускімі рэперамі будзе будаваць новую беларускую якасць у культуры.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 34

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 30:

Ева, мужык, ну, рота, хлеб, жыта, акоў, сок, Ян. Ген, нос, вуха, вежа, бык, мур, ток, жораў, быт, Качан.

Узнагароды, кампакт-дыск з беларускай музыкай, выйграла **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



НАД БУГАМ ДЫЯЛОГІ ЧАЛАВЕКА З КУЛЬТУРАЙ



Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

— Можа гэта не надаецца ў газету, — гаворыць сцішаным голасам войт Мельніцкай гміны Яўген Віхоўскі, — але ў Мельніку бывае, што ў адной хаце жывуць людзі трох веравызнанняў.

Як тады шукаць лепшага месца для міжчалавечых дыялогаў. Войту было дваццаць восем гадоў, калі пачаў несці сваю службу лакальнай грамадскасці і, як падкрэслівае, адным з яго першых рашэнняў на пасадзе войта была спроба арганізацыі міжкультурных прэзентацый.

— Калі пачалася сапраўдная дэмакратыя ў Польшчы, мы хацелі ў Мельніку пахваліцца сваёй шматкультурнасцю ды паказаць адкрытасць на іншых, — дадае.

Часта гаворыцца, што Мельнік — гэта такі канец свету. Хаця за рэчкай яшчэ не мяжа, то ўсё ж такі адчуваецца, што Буг вызначае нейкую акрэсленую тэрыторыю. Адчуванне тое тлумачыць Ян Сычэўскі, старшыня Беларускага грамадска-культурнага таварыства, арганізацыйны партнёр мерапрыемства, якое з пачатку 1990-х гадоў называецца „Музычнымі дыялогамі над Бугам”:

— Мельнік і Буг вызначаюць культурную мяжу тэрыторыі, на якой пражываюць нацыянальныя меншасці Падляшша. Асабліва важна для нас, што гэта Сямятыцкі павет, дзе ў ліку іншых меншасцей працэнтна найбольш беларусаў. Калісь тут развівалася беларускае школьніцтва. Ёсць традыцыі, якія варта падтрымліваць.

Ад трох гадоў галоўным рашаючым пра кшталт „Дыялогаў” з'яўляецца малады і энергічны дырэктар Асяродка культуры, спорту і рэкрэацыі ў Мельніку Міхал Бараноўскі. Пераехаў ён у Мельнік ажно з Ажарова ў Свентакшыскім ваяводстве. Як сам кажа, Мельнік мае шмат козыраў і першымі пералічвае цудоўны краявід і распалажэнне мясцовасці.

— Адчуваем сябе выключнымі, — дадае, — але не толькі з-за прыгажосці ландшафту, толькі перш за ўсё з-за ідэі, якую маю магчымасць працягваць. Вялікім гонарам для нас з'яўляецца факт, што належным чынам ацаніла нас Міністэрства культуры і нацыянальнай спадчыны. Няшмат мерапрыемстваў, якія прамуюць культуру нацыянальных меншасцей, гэтае міністэрства лічыць вартасным са свайго пункту гледжання. Мы, відаць, нясем нашым наведвальнікам звышвартасныя ідэі.

Гэтыя словы знаходзяць пацвярджэнне ў наведвальнікаў мельніцкіх сустрэч. Трэба сказаць, што „Дыялогі” звязваюць сваіх прыхільнікаў на многія гады.

— Мы тут кожны год, на бацькаўшчыне, — на беразе Буга з сям'ёй сядзіць рэктар Універсітэта ў Беластоку праф. Юры Нікітаровіч. — Гэта дасканалы прыклад негацыяцыйнага дыялогу, які дае шанс развіцця кожнаму боку. Гурты адчуваюць сябе добра і нам даюць шанс такога адчування і добрай гульні. А дзе гульня — там і радасць.

— Я нават не помню колькі гадоў прыязджаем сюды з сябрамі, — прызнаецца Эля. — Бывала, што начавалі нават на беразе ракі, не вярталіся дахаты ці ў палаткі. Проста засыналі, слухаючы музыку і гоман гуляючых побач людзей.

— Бачыш, — штурхае свайго калегу мужчына з залатым зубам, — яны выступалі ў Чаромсе. Ведаем гэты гурт, добра іграюць, — зіхаценне золата радаснага жыхара Сямятыч адбіваецца ў маім воку. — Ад нас тут блізка, то ездзім кожны год — тлумачыць, — а так пры нагодзе то і жонку шукаю, — смяецца.

Сямятыцкі слухач пападае ў той самы тон, што і мельніцкі войт.

— Найбольшая прамоцыя Мельніка праяўляецца ў тым, што нават дзесьці з-пад Вроцлава прыязджалі хлопцы шукаць сабе жонак, — распавядае Яўген Віхоўскі. — Дваццаць гадоў нашых „Дыялогаў” выхавала новае пакаленне. Маладыя людзі зараз больш адукаваныя. Яны гавораць на сваіх мовах, не цураюцца. Прыязджаюць сюды, бо адчуваюць свабоду. Адзін гаворыць па-польску, другі адказвае па-беларуску, украінску ці на іншай мове. Гэта нармальная сітуацыя. Мае сыны спыталі мяне не так даўно: „Тата, чаму ты не вучыў нас сваёй роднай мове?”. Вядома, садок, школа, па-польску лягчэй, але зараз яны самі вяртаюцца да мовы дзядоў і бацькоў. Гэта моц „Дыялогаў”.

Хаця войт успамінаў таксама і цяжкія моманты, калі відаць было, што нейкія вышэйшыя ўлады хацелі знішчыць шматгадовую працу вакол гэтага мерапрыемства, то зараз ім нічога не пагражае. Затое бывала, што сустракаліся тут і важныя асабістасці, напрыклад, каб абмеркаваць пытанне пераходу ў Такарах. Міжнацыянальныя сувязі, шматбаковыя візіты гасцей з іншых гмін дапамаглі стварацъ шырэйшыя і больш эфектыўныя, гэтак званыя „цвёрдыя” праекты, якія фінансуюцца Еўрасаюзам.

— Калі Польшча ўваходзіла ў Еўрасаюз, а нашы людзі баяліся невядомага, я тады адказваў: „У нас унія ўжо з 1501 года”, — ганарыцца войт.

Мельнік запісаўся ў гісторыі як месца завязання ўніі між Каронай і Вялікім Княствам Літоўскім, запісы якой можна палічыць няздзейсненымі. Была аднак узорам для пазнейшай Люблінскай уніі і адлюстроўвала тагачасны стан адносін паміж абедзвюма краінамі. Блізкасць Драгічына дазваляла таксама лічыць Мельнік адным з пунктаў „Ягелонскага шляху”, з Кракава ў Вільню. Гэтая багатая спадчына спрычынілася да таго, што ў юбілейным 2001 годзе падпісання Мельніцкай уніі, у час мерапрыемства турыстычная арганізацыя „Ягелонскі шлях” афіцыйна прысвоіла Мельніку званне гаспадара „Ягелонскага шляху”. Гэта чарговы козыр, якім гэты прыбугскі гарадок будзе прыцягваць турыстаў і аматараў гісторыі ў наступным годзе.

Сёлетнія юбілейныя XX Музычныя дыялогі над Бугам таксама мелі новыя атракцыёны, у якіх моцна рысавалася беларуская прысутнасць.

— Стараемся не аддаваць перавагі ніякім меншасцям, — гаворыць Міхал Бараноўскі, — але вядома, што хаця б па прычыне блізкасці беларускай і ўкраінскай межаў гэтых выканаўцаў бывае больш.

Арганізацыйны партнёр мерапрыемства, БГКТ, дапамагло не толькі ў запрашэнні беларускіх выканаўцаў, але таксама сарганізавала кірмаш кніжкі і рукадзелля. Янка Заброцкі з Цэнтра славянскай культуры ў Варшаве прывёз кніжкі аўтараў напэўна ўсіх нацый, якія прэзентаваліся на „Музычных дыялогах”. Можна было купіць кніжкі Літаб'яднання „Белавежа” ды яго старшыні, беларускага паэта Яна Чыквіна і атрымаць аўтограф. Сваю кніжку „Хата поўная экспанатаў” падпісвала таксама нараўчанская настаўніца беларускай мовы Анна Кандрацюк. Пасярэдзіне фестывальнай пляцоўкі можна было пазнаёміцца з рукадзеллем Берасцейшчыны. Ларыса Быцко, этнограф і фанат, як пра сябе кажа, заахвочвала паглыбіцца ў тайны беларускіх майстроў. Яна, адзетая ў стогадовую вышываную кашулю і фартух з Бездзежа, была жывой рэкламай свайго рэгіёна.

— Бездзежскія фартухі гэта шэдэўры беларускага народнага мастацтва, — ганарыцца і дадае: — Нам вельмі цікава прыязджаць на такія мерапрыемствы. Я, праўда, часта гасцюю ў Дарафея Фіёніка са сваімі праектамі, але трэба пазнаваць і іншае. Народным майстрам патрэбны кантакт з людзьмі і прэзентацыя сваёй працы. А ёсць нам чым ганарыцца.

Сваёй творчасцю ганарыліся таксама беларускія калектывы: „Арт-Пронар” з Нарвы, які на гэты раз спяваў па-беларуску і па-руску, „Стрэчанне” і „Сваякі” Палаца культуры Нафтаперапрацоўчага завода з Мазыра. Лідар апошняга падкрэслівае, што „Музычныя дыялогі” гэта неспатыканае мерапрыемства. Усюды, дзе былі запрошаныя, у Польшчы, Нямеччыне, Украіне, гурты іншай нацыянальнасці з'яўляюцца адзінкамі, а тут поўны выбар розных культур.

— Цудоўная ідэя і сапраўды сяброўская атмасфера, — падводзіць Аляксей Зайцаў.

У амфітэатры „Тапаліна” ў Мельніку прэзентаваліся гурты адзінаццаці меншасцей, розных моў і розных стыляў, ад скафольку па эстраду. XX Музычныя дыялогі над Бугам чарговы раз аб'ядналі гледачоў і выканаўцаў.

— Я вам скажу па-хрысціянску пра „Дыялогі”, — падводзіць войт. — Калісь будавалі Вавілон, але разышліся, бо Бог памяшаў мовы. Я веру, што сёння можам гаварыць на розных мовах, але галоўнае тое, што маем у сэрцы.

ПЕРАТОЧА-2010

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Летам у Белавежы збіраецца столькі турыстаў, што калі б усе палюбілі адно месца ў Белавежскай пушчы, дык затапталі б яго датла. Пра Белавежу і яе адметнасці ведае выдатная большасць жыхароў Польшчы, а больш дакладна энтузіясты прыроды. Аднак любіцелі назірання за прыродай, так як энтузіясты збірання марак або гульні ў шахматы, найчасцей цікавяцца таксама культурнымі прапановамі. Арганізатары культурнага жыцця на Гайнаўшчыне, ці нават у яе суседніх рэгіёнах, калі хочуць выйсці са сваімі прапановамі па-за мясцовае насельніцтва, ахвотна ладзяць мерапрыемствы ў турыстычнай Белавежы або ў яе наваколлі, бо гэты рэгіён штогод наведвае больш за 100 тысяч турыстаў. Самым маштабным мерапрыемствам у Белавежы несумненна з'яўляецца беларускае „Купалле". Ва Усеагульным універсітэце ў Тэрэміскаx стаў пастаянна ладзіць свае канцэрты Музей малой айчыны са Студзіводаў. Неўзабаве фэст у Пагарэльцах будзе арганізаваць Музей і асяродак беларускай культуры з Гайнаўкі. Побач асяродка „Ягелонскае" ў Белавежскай пушчы ладзяцца канцэрты ў рамках Міжнароднага фестывалю „Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі". У Белавежы арганізуюцца таксама іншыя цікавыя мерапрыемствы. З найбольшай колькасцю прапаноў да жыхароў Белавежы і турыстаў выходзіць Фонд „Царкоўная музыка" з Гайнаўкі, з якіх хіба самымі блізкімі для нашага беларускага асяроддзя з'яўлюцца Белавежскія мастацкія інтэграцыйныя сустрэчы „Ператоча", на якіх пастаянна выступаюць беларускія калектывы, як з Рэспублікі Беларусь, так і мясцовыя, бо і беларусы тут здаўна састаўлялі большасць мясцовага пушчанскага і прыпушчанскага насельніцтва. Сярод публікі беларусы, побач турыстаў, таксама састаўляюць вялікую частку сабраных. Ідэя „Ператоча" — паказаць пушчанскія і прыпушчанскія тэрыторыі, дзе жылі і працавалі людзі розных нацыянальнасцей, веравызнанняў і культур. 6 і 7 жніўня, калі адвячоркам у белавежскім амфітэатры праходзілі VII Белавежскія мастацкія інтэграцыйныя сустрэчы „Ператоча-2010", сярод публікі было многа турыстаў і мясцовага насельніцтва, што прыехалі сюды, каб адпачыць пры разнароднай музыцы.

Народныя танцы прэзентавала танцавальная група Тэатра танца „Ойра" з Пружан

— „Ператоча" — беларуская назва месца перад варотамі клуні і мы зараз знаходзімся перад тымі ж варотамі і токам, — тлумачыў сабраным галоўны арганізатар мерапрыемства, старшыня Фонду „Царкоўная музыка" Мікола Бушко, указваючы на намаляваныя ззаду сцэны адчыненыя вароты клуні. — Мы будзем прэзентаваць культуру нацыянальнасцей, якія тут жывуць і жылі ў мінулым. Тут польска-беларускае пагранічча і таму будзем весці мерапрыемства на польскай і беларускай мовах (вялі Мікола Бушко і Барбара Кэндысь). Рэгіён Белавежскай пушчы лічым непадзельным і таму запрашаем на мерапрыемства калектывы з абодвух бакоў адносна нядаўна ўстаноўленай мяжы.

Арганізатары мерапрыемства часта напамінаюць, што ў мінулым за ператочам і варотамі ў клуні адбывалася вясковае культурнае жыццё, ладзіліся народныя танцы і спевы, якія прэзентаваліся таксама ў час белавежскай імпрэзы. Войт Белавежскай гміны Альберт Літвіновіч, адкрываючы мерапрыемства, гаварыў пра сутыкненне ў час „Ператоча" разнародных культур з цудоўнай прыродай Белавежскай пушчы. У гэтым годзе, так як і ў мінулым, у час „Ператоча" была вельмі заўважальная дамінацыя беларускай культуры, а дакладней кажучы, беларускай песні. Перад публікай з беларускім рэпертуарам выступіла пяць калектываў з Гарадоцкай гміны, якія эмацыянальнымі і прыгожымі беларускімі песнямі захапілі нават прыезджую публіку. Былі гэта народная капэла „Хутар", вакальныя калектывы „Асенні ліст" і „Расспяваны Гарадок" з Гарадка, ды вакальны калектыў „Каліна" і эстрадная маладзёжная група „Калінка" з Залук.

Беларускія песні ўдала заспявалі дзве вакальныя групы з Белавежскага асяродка культуры (другая стаіць ззаду) пад акампанемент акардэаніста Марка Зубрыцкага

— Разам з усімі калектывамі з нашай гміны мы яшчэ не выступалі ні ў Белавежы, ні ў іншых месцах Гайнаўшчыны, — заявіла спявачка з „Каліны".

— Мы ў час „Ператоча" стараемся прэзентаваць найбольш актыўныя культурныя асяроддзі ў нашым рэгіёне. У мінулым годзе выступалі ў нас калектывы з Бельскага дома культуры, а ў гэтым годзе запрасілі мы самі мадзейнікаў з Гарадоцкай гміны, якія вылучаюцца ў нашым асяроддзі. Гарадок — старажытная мясцовасць з вялікімі традыцыямі. Выступы калектываў з гэтай гміны мы назвалі „Спадчынай Хадкевічаў" — заснавальнікаў гэтага мястэчка, — сказаў Мікола Бушко.

Беларускія песні ўдала прэзентавалі таксама дзве вакальныя групы з Белавежскага асяродка культуры. Малодшыя выканаўцы выступалі ўжо на фэстах ладжаных Музеем і асяродкам беларускай культуры з Гайнаўкі, а старэйшая група на так вялікай імпрэзе выступіла публічна ўпершыню. Абодвум калектывам акампануе акардэаніст Марк Зубрыцкі, які зварухнуў даўней расспяванае белавежскае асяроддзе да чарговага сарганізавання калектываў і да выступаў з беларускім рэпертуарам на сцэне. Можа, калі б у Комплексе школ у Белавежы, а раней у Падставовай школе вялося навучанне беларускай мовы, маладыя людзі з Белавежы і наваколля яшчэ раней праявілі б сваю актыўнасць у галіне прапагандавання беларускай песні і заадно беларускай культуры, але добра што гэта адбылося цяпер.

— Я прапанаваў сарганізаваць у нашай школе навучанне беларускай мовы, бо дзеля гэтага былі б дадатковыя сродкі, якіх заўсёды ў адукацыі не хапае, але беспаспяхова, — заявіў старшыня Рады Белавежскай гміны Ян Гвай.

У час беларускіх мерапрыемстваў у Белавежы была магчымасць слухаць беларускія песні. Маладыя белавежцы ўрэшце „пераламаліся" і самі пачалі публічна спяваць па-беларуску. Народныя танцы запрэзентавала танцавальная група Тэатра танца „Ойра" Пружанскага палаца культуры. Усіх танцораў там каля сарака чалавек, але ў Белавежу прыехала дванаццаць асоб. Выступілі яны з лявоніхай, падыспанам і кракавякам, на другі дзень вучылі народным танцам публіку.

— Зараз нам складана дабірацца на вашыя мерапрыемствы, бо трэба чакаць, каб атрымаць візы. Мы разлічваем, што ў хуткім часе ўступіць у сілу закон аб малым памежным руху. У нас да мяжы 46 кіламетраў і мы спадзяемся, што нас уключаць у памежную зону і тады будзем прыязджаць да вас без лішніх складанасцей, — заявіў кіраўнік танцавальнай групы Васіль Пілюцік.

Беларускія танцоры ў Белавежы выступілі ўпершыню. Атмасфера „Ператоча" ім спадабалася.

Усяго выступіла 8 беларускіх калектываў, а 6 калектываў прадстаўлялі польскую і іншыя нацыянальнасці. Польскія песні спявала народная капэла „Забузакі" з Сямятыч, цыганскія песні і цыганскую культуру паказваў калектыў „Цыганскія жамчужыны" з Беластока, а жыдоўскія песні прэзентаваў клезмерскі калектыў „Etz Chaim" з Вроцлава. Татарскую арыентальную культуру паказаў калектыў „Peregrinus", таксама з Вроцлава. З украінскім фолькам выступілі маладыя людзі з калектыву „Русічы" з Адэсы, а з літоўскім — калектыў „Kreizas" з Вільні, якога выступы былі скарочаны з-за буры, што ўзарвалася над Белавежскай пушчай. Мерапрыемства традыцыйна адкрылі трубачы, а яшчэ да канцэрта ўдзельнікі сустрэч ездзілі на брычках па Белавежы і спевам запрашалі на „Ператоча". Арганізатару мерапрыемства Фонду „Царкоўная музыка", які ладзіць яго ў супрацоўніцтве з Белавежскім нацыянальным паркам, Белавежскім асяродкам культуры і мясцовым аддзяленнем ПТКТ удаецца запрашаць штораз то новыя калектывы, прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей, што робіць мерапрыемства цікавым не толькі для выпадковых турыстаў, але і для яго пастаянных наведвальнікаў. Цешыць, што многа месца ў час „Ператоча" адводзіцца беларускай песні і беларускай культуры, якая была дамінуючай на пушчанскіх і прыпушчанскіх тэрыторыях.

Беларусы ў сеймавай кнізе

— Ведаю пра тое, з сустрэч з калегамі-дэпутатамі і чыноўнікамі ў Польшчы, што веды ў іх пра меншасці вельмі сціплыя, — сказаў шматгадовы дэпутат Сейма ад левых дэмакратаў Яўген Чыквін, прадстаўляючы кнігу *Białorusini*. — Я выступіў з ініцыятывай выдаць Сеймам кнігі пра меншасці. Кніга „Białorusini" асаблівая. Першы раз у гісторыі польскага парламентарызму сеймавае выдавецтва, якое займаецца звычайна юрыдычнай праблематыкай, заканадаўствам і крыху гісторыяй, рашылася выдаць, першую, кнігу прысвечаную беларускай нацыянальнай меншасці. Гэта першая кніга з цыкла прэзентуючага польскія нацыянальныя і этнічныя меншасці. Ідэя выдання такой кнігі прарасла сярод асоб, якія, як і я, прысвячаюцца праблематыцы меншасцей, якія ведаюць і бачаць, як цяребяць меншасці асіміляцыйныя працэсы. Веды пра меншасці не толькі сярод „шэрых" грамадзян, але нават і палітычных эліт краіны, аб чым я меў магчымасць пераканацца, далікатна кажучы, скромныя. Кніжка мае інтэрдысцыплінарны характар, накіравана яна ў першую чаргу да студэнтаў, дзяржаўных чыноўнікаў, таксама дэпутатаў. Аўтарамі з'яўляюцца вядомыя і аўтарытэтныя даследчыкі. Выдана яна невялікім тыражом у тысячу асобнікаў. Даступная будзе ў бібліятэках і ўстановах.

фота Міры ЛУКШЫ

Кожны з тамоў цыкла будзе дэталёва характарызаваць адну нацыянальную або этнічную меншасць у Польшчы. У законе ад 6 студзеня 2005 г. аб нацыянальных і этнічных меншасцях і рэгіянальнай мове пералічваецца 9 нацыянальных меншасцей і 4 этнічныя меншасці. Апрача таго аховай ахоплена таксама рэгіянальная кашубская мова. Таму серыя будзе налічваць — дадаўшы кашубаў — 14 тамоў. Камісія нацыянальных і этнічных меншасцей Сейма РП, па ініцыятыве якой узнікнуць гэтыя зборнікі, лічыць, што папулярызацыя ведаў аб нацыянальных і этнічных меншасцях ды аб правах гэтых грамадскасцей з'яўляецца дзеяннем неабходным для захавання і развою тоеснасці меншасных асяроддзяў.

Беларусы гэта 1/5 частка ліку меншасцей у Польшчы. Афіцыйныя даныя значна меншыя чым меркаванні сацыёлагаў і этнографаў. Шмат беларусаў, прымушаных да адназначнага выяўлення сваёй нацыянальнасці, запісала сябе палякамі, — мяркуе Яўген Чыквін.

На 176 старонках кнігі паяўляюцца аўтары, з якіх найменшае навуковае званне — у магістра Кандрата Паўлючука, які распавядае пра беларускія аматарскія спявачыя калектывы на Падляшшы пасля 1956 г. Тэксты напісаны навукова-аб'ектыўна, перш за ўсё для членаў польскай большасці, але спатрэбяцца таксама і сябрам з нашай грамады. Выбар вельмі цікавы і ў апрацоўцы сапраўдных навуковых аўтарытэтаў. Прафесар Яўген Мірановіч у змястоўным артыкуле „Беларусы ў Польшчы (1919-2009)", пачынаючым агляд беларушчыны ў Польшчы, абмярковае тэму ад моманту спробы беларусаў стварэння ўласнай дзяржаўнасці ў 1918 годзе. Прафесар Альжбета Чыквін разважае аб „Праблемах асіміляцыі ў кантэксце грамадскай стыгмы". Анна Радзюкевіч піша пра „Гісторыю і культуру праваслаўя", Юры Каліна — пра „Беларусаў у прэсе, радыё і тэлебачанні (1956-2008)", Ева Раманоўская — пра „Беларускую школу ў Польшчы ад часу II да III Рэчы Паспалітай", Іаанна Тамальская — пра „Мройны пейзаж — творчасць беларускіх мастакоў у Польшчы пасля II сусветнай вайны", Тэрэса Занеўская (рэдактар выдання) — пра Беларускае літаратурнае аб'яднанне „Белавежа" (два артыкулы, на жаль, старыя). Тэкстаў было заказаных больш, ды не ўсе аўтары паспелі даслаць іх у выданне. Найсвяжэйшае даследаванне — музейніцы і гісторыка мастацтва Іаанны Тамальскай, якая сапраўды рупліва перашукала архівы і памяць усіх, хто меў дачыненне да мастацкага жыцця беларускай грамады, і якой досвед прыдасца, напрыклад, для скамплектавання збору твораў аўтараў з беларускай меншасці, які будзе змешчаны ў бельскім музеі.

Міра ЛУКША

Беларускія нацыянальныя суполкі, якія існуюць у розных краінах свету, парознаму будуюць сваю дзейнасць. У некаторых гэта адбываецца паспяхова, у некаторых — не вельмі. Паколькі на сённяшні дзень займець уласны сайт у інтэрнэце вельмі лёгка, то адсачыць па яго абнаўленнях актыўнасць той ці іншай суполкі таксама не вымагае вялікай працы.

„Беларусы ў Швецыі" — адна з суполак, якая фармальна арганізавалася не так даўно — у кастрычніку 2009 года. Праз невялікі час у яе з'явілася прадстаўніцтва ў інтэрнэце, якое месціцца па адрасе http://sverigesbelarusier.se.

Выява сайта распрацавана даволі сціпла, але прывабна. Падзелены на дзве часткі сайт утрымлівае некаторыя карысныя звесткі пра жыццё і дзейнасць беларусаў у Швецыі. З левага боку на кожнай старонцы месціцца асноўная інфармацыя, з правага — архіў сайта, які па сутнасці з'яўляецца паўторам іншых рубрык.

„Нас, беларусаў, не так багата ў Швецыі. І гэта натуральна, што мы хочам быць разам. Гэты сайт пазнаёміць Вас з нашай суполкай, з календаром падзей, нашым жыццём. Вы таксама даведаецеся, як можна далучыцца да нас", — гаворыцца ў вітанні распрацоўшчыкаў сайта да наведвальнікаў на першай старонцы.

Найбольш насычанай інфармацыяй з'яўляецца рубрыка „Пра нас". Менавіта адсюль цікаўны карыстальнік можа даведацца, што 24 кастрычніка 2009 года ў Стакгольме адбыўся ўстаноўчы сход беларусаў Швецыі. Сход абмеркаваў і прыняў статут згуртавання, сімволіку арганізацыі, а таксама абраў раду суполкі. На жаль, прачытаць гэтыя дакументы не ўдасца — няма іх на сайце.

Як і належыць нацыянальнай меншасці, шведскія беларусы ўсяляк расхвальваюць беларускую нацыю. „Наша суполка зыходзіць з таго, што беларусы — гэта вялікі еўрапейскі народ, лёс якога з'яўляецца часткай нашай агульнай еўрапейскай гісторыі, — распавядаюць яны пра свае погляды на беларускі народ. — Беларусы вынеслі на сваіх плячах мноства еўрапейскіх войнаў, уключаючы барацьбу супраць фашызму падчас другой сусветнай вайны. Біблія на беларускай мове друкавалася ў Еўропе ўжо ў першай палове 16 стагоддзя. Беларусы ніколі не пачыналі войнаў, жылі і сябравалі са сваімі суседзямі і пачэсна і шчыра працавалі дзеля агульнага еўрапейскага міру і дабрабыту".

Сярод мэт, якія аб'яднаныя беларусы ў Швецыі ставяць перад сабой — абарона інтарэсаў беларускай этнічнай меншасці ў Швецыі, спрыянне развіццю кантактаў паміж народамі Швецыі і Беларусі, спрыянне захаванню беларускай мовы і ідэнтычнасці, вядзенне педагагічнай дзейнасці ў галіне літаратуры і навукі, спрыянне ўстойлівому развіццю Беларусі, распаўсюд ведаў і абуджэнне грамадскай думкі вакол Беларусі ў Швецыі.

Рубрыка „Навіны", выйсце да якой знаходзіцца ўверсе выяўлення, размешчаная апошняй у агульным пераліку. Гэта крыху дзіўнавата, бо звычайна апошнія паведамленні стаяць першымі.

Абнаўленне навін з'яўляецца адным з галоўных чыннікаў ацэнкі паўнавартаснага жыцця кожнага інтэрнэт-рэсурса. На жаль, пра сайт „Беларусы ў Швецыі" цяжка сказаць, што ён у цяперашні момант неяк развіваецца — за 5 месяцаў на ім не было размешчана ніводнага навіннага паведамлення.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь,беларусы...

Сапраўды прагрэс?

Поспехі беларусаў у сёлетнім розыгрышы еўракубкаў наводзяць на пытанне ці сапраўды ў айчыннай гульні нумар адзін назіраецца рост майстэрства і прагрэс. Лакальныя ўдачы каманд адны тлумачаць тым, што ў нас сезон у самым разгары, іншыя даводзяць, што айчынным дэлегатам у еўракубках папросту пашанцавала. З апошнім пагадзіцца нельга. Прыкладам тут магілёўскі „Днепр" — беларуская каманда нумар адзін гэтым летам. Мяркуйце самі — падначаленыя Андрэя Скарабагацькі паслядоўна адолелі нарвежскі „Стабек" і чэшскі „Банік" — клубы з краін, якія маюць досыць высокую рэпутацыю. Апошнім бар'ерам на шляху ў асноўны раўнд стане іспанскі „Вільярэал". „Дняпру" не пашанцавала пры лёсаванні, прайсці грозных пірэнейцаў падаецца малаэрэальным. Згадваецца як пару гадоў таму капітуляваў перад гэтай камандай барысаўскі БАТЭ — 1:4 і 0:2. Будзем спадзявацца, што магілёўцы дадуць бой прадстаўніку мацнейшай лігі кантынента. Мінскія дынамаўцы сваім парадкам ужо скокнулі вышэй галавы. Саступіўшы ў ізраільскай Хайфе „Макабі", дома бела-блакітныя, па меркаванні многіх, не мелі агульных шанцаў. Але маленькі цуд здарыўся — не без дапамогі фартуны дынамаўцы перамаглі 3:1 і цяпер іх чакаюць паядынкі з прадстаўніком Бельгіі „Бруге". Поспехі бельгійцаў астатнім часам на міжнароднай арэне досыць сціплыя. Чаму б беларускім сталічнікам не замахнуцца на выхад у групавы турнір Лігі Еўропы. Мае шанцы на гэты этап і БАТЭ, хоць сапернік у выхаванцаў Віктара Ганчарэнкі досыць спецыфічны — партугальскі „Марыціму". Барысаўцы ўжо маюць досвед спабору з партугальскім грандам „Бенфікай", цяпер іх чакае выпрабаванне больш сціплай камандай. Усе матчы плэй-оф пройдуць 19 і 26 жніўня. БАТЭ пачынае дома, „Днепр" і „Дынама" — на выездзе.

Удалы летні выступ беларускіх клубаў прывёў да таго, што Беларусь з паказнікам 3,125 узначаліла рэйтынг сезона. У зводнай жа класіфікацыі за 5 апошніх гадоў удалося абысці Польшчу і стаць на 25-ю пазіцыю. Пры ўдалай гульні далей ёсць шанцы апярэдзіць і Харватыю з Нарвегіяй.

На мажорнай ноце выступіла і нацыянальная зборная Беларусі ў таварыскім спатканні з Літвой. У Каўнасе каманда Бернда Штанге выйграла 2:0. Паўночныя суседзі, хоць і стаяць вышэй у рэйтынгу ФІФА, як правіла, сапернік для беларусаў зручны. Менавіта ў паядынку з ім Беларусь некалі здабыла найбуйнейшую ў сваёй гісторыі вікторыю — 5:0, а ўсяго была гэта ўжо 7-я сустрэча. Пасля некаторага перапынку вярнуліся ў зборную Аляксандр Кульчы, Аляксандр Глеб і Віталь Кутузаў, якім нямецкі трэнер даў згуляць па тайме. А галоўным героем сустрэчы стаў Глеб-малодшы — Вячаслаў, які запісаў на свой рахунак дубль. Цяпер ва ўдачлівага форварда ўжо 10 галоў за зборную.

Моладзевая дружына Беларусі пад кіраваннем Георгія Кандрацьева правяла вельмі важны афіцыйны матч у адборы да чэмпіянату кантынента. У Аўстрыі беларусы дамагліся вельмі важнай у стратэгічным плане нічыёй — 3:3. Прычым цягам гульні саступалі два галы, але ў канцоўцы адыграліся. Мячы ў нашых забілі Міхаіл Сівакоў і Дзмітры Рэкіш — два. Становішча ў табліцы: Аўстрыя — 14 ачкоў (7 матчаў), Шатландыя — 13 (6), Беларусь — 13 (6), Албанія — 4 (7), Азербайджан — 1 (6). Цяпер усё ў руках беларускіх андэраў. 3 верасня яны згуляюць дома супраць шатландцаў. Перамога фактычна гарантуе выхад у плэй-оф кваліфікацыі. 7 верасня заключны матч таксама на сваім полі з Азербайджанам.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Вельмі важна, што пішу на роднай мове

Віктар БУРА

Час імкліва бяжыць наперад, многа змяняецца ў жыцці грамадства. Тое, што ўчора было цікавым, важным, актуальным, сёння раптам здаецца наіўным, непатрэбным. Такі працэс адбываецца ва ўсіх сферах чалавечага жыцця, што пільна адлюстроўваюць сродкі масавай інфармацыі — прэса, радыё, тэлебачанне, інтэрнэт.

У гэтым працэсе ўдзельнічаю і я — ніўскі карэспандэнт. У сваіх артыкулах і допісах апісваю нашу рэчаіснасць, вяртаюся ўспамінамі ў мінулае, дзялюся з чытачамі сваімі думкамі на тэму нашай малой айчыны. Вельмі важным лічу тое, што пішу на роднай беларускай мове, што публікую на старонках беларускага штотыднёвіка „Ніва". Ці ж гэта не скарб? „Ніва" друкуе цікавыя артыкулы для дарослых і дзяцей пра любоў да роднай мовы, да роднай зямлі. Яна злучае беларускае асяроддзе ў Польшчы ўжо дзесяцігоддзямі, выходзіць на беларусаў на Бацькаўшчыне і ў іншых краінах. З нашай газеты даведваемся пра ўсё, што цікавіць беларусаў тут, у нас, і ў замежжы. Газета — сродак нашага духоўнага яднання з нашымі каранямі, пра якія ні нам, ні нашым нашчадкам забываць нельга.

Кожны чацвер за кавай і гарбатай жанчыны з Рыбакоў абмяркоўваюць свежы нумар „Нівы". Злева: Зіна Хлябіч, Ніна Бура, Данута Гаравінская і Марыя Хлябіч

Публікаваныя ў „Ніве" артыкулы перапоўненыя любоўю да нашай малой айчыны. Сёння нікому не скарэт, што ва ўмовах рынку кожны журналіст, карэспандэнт, газета стараюцца свой тавар — артыкул — зрабіць цікавым для чытача. Тое ж робяць ніўскія супрацоўнікі, імкнучыся выцягвавць чытачоў з душных гарадскіх кватэр на чыстую нашу прыроду.

Колькі вясковых дарог праехалі і прайшлі ніўскія журналісты, колькі грунтоўных рэпартажаў і карэспандэнцый з нашай глыбінкі з'явілася на старонках штотыднёвіка. За адказную і складаную працу журналістам і карэспандэнтам — шчырае дзякуй! Жадаю ім выдатнага здароўя і бездакорнай творчасці, якая стымулюе людзей рабіць дабро бліжняму, бо менавіта ў гэтым першаасновa маралі любога грамадства.

Летапіс чаромхаўскай асветы

Уладзімір СІДАРУК

(2)

Возьны і Сахацкая, каб пазбегчы вывазкі на прымусовыя работы ў Нямеччыну, сталі працаўнікамі чыгункі. Пахадайнічаў за гэта былы польскі настаўнік Місевіч, які на станцыі арганізаваў патаемнае навучанне. Афіцыйна вёў ён вечаровыя курсы для чыгуначнікаў. Невядома, якая была праграма навучання. Такая сітуацыя доўжыўлася да 1 лістапада 1944 года.

Чаромхаўскія настаўнікі пасля вайны неадкладна ўзяліся за арганізаванне школы. Змяшчалася яна ў прыватным будынку непадалёк млына Раеўскага. Паравознае дэпо забяспечыла школу дошкамі, з якіх зрабілі часовую мэблю. Урокі праходзілі ў двух залах. Створана пяць класаў з агульным лікам пад сотню вучняў. Не было падручнікаў і сшыткаў. У навучальным годзе 1945/1946 сітуацыя палепшылася. Прыбыло двух настаўнікаў. У прыватнай кватэры („На Пясках" — за цяперашнім касцёлам) арандавалі дзве вучэбныя залы. Лік вучняў павысіўся да 160. Стварылі сем класаў. Арганізавалі курс для пачаткоўцаў. Вяла яго Стэфанія Сахацкая. Настаўнік Гішык стварыў школьны хор, які на гмінным аглядзе заняў I месца. Патранат над школай узялі чыгуначнікі. Заснавалі бацькоўскі камітэт, які аказваў вялікую дапамогу школе. У чарговым навучальным годзе 1946/1947 (пры выдатнай дапамозе бацькоў) пачалася будова барака. У ім мелі змяшчацца ўсе класы. У грамадскай працы вылучыліся начальнікі чыгуначных прадпрыемстваў: Ажынскі, Гібак і Плахта. У новую школу вучняў перасялілі ў пачатках пяцідзесятых гадоў. Школа стала зборнай для дзетак з Чаромхі-вёскі, Вулькі-Тэрахоўскай, Апакі і Беразышча. Апрача сямі залаў для навучання быў адведзены пакой для настаўнікаў. Палепшыліся сацыяльна-бытавыя ўмовы — арганізавалі падкормліванне. Ладзіліся вечаровыя курсы для працоўных у зімовым сезоне. На курсах заняткі вяліся ў пятым і сёмым класах.

У навучальным 1950/1951 годзе папаўняюцца настаўніцкія кадры. У Чаромху прыязджае Юзаф Монсяль з жонкай Марыяй. Яго назначаюць кіраўніком школы. У гэтым часе вучылася 270 вучняў у дзевяці аддзяленнях. Былі два пятыя і два сёмыя класы. Паколькі школьны барак аказаўся замалым, дык зрадзілася ідэя пабудовы мураванага двухпавярховага школьнага будынка. Меркавалася ў ім памесціць гімнастычную залу, святліцу, кухню, дзве жылыя кватэры для настаўнікаў, а будоўлю забяспечыць у электрычнасць, водапровад і каналізацыю. Палепшэнні ўмоў працы і навукі ў новай школе спадзяваліся настаўнікі, бацькі і дзеці, паколькі барак стаў нявыгадным, а ў зімовы час было ў ім холадна (ацяпляўся перасоўнымі жалезнымі печкамі). Будова замаруджвалася. Вучні паслалі пісьмо Баляславу Беруту з просьбай аб дапамогу.

У 1952/1953 годзе настаўнікі актыўна ўзелічвалі ў парламенцкіх выбарах, а школьнікі арганізавалі шмат культурных мерапрыемстваў, м.інш. навагоднюю ёлку, 1 Мая, Дзень дзіцяці, заканчэнне навучальнага года, гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. Большасць выпускнікоў сёмага класа працягвала вучобу ў сярэдніх школах.

У 1953/1954 годзе кіраўніком школы стаў Згерскі, які дагэтуль настаўнічаў у Чаромсе-вёсцы. На гэтай пасадзе працаваў паўтара месяца. Пасля перавялі яго на іншую працу. Кіраўніцтва пераняла Станіслава Ратыняк. Падаўся ў адстаўку па прычыне хваробы Мікіта Карповіч, які выходзіў з суседніх Хлявішчаў, а навучаў у старэйшых класах арыфметыцы і рускай мове.

Надышлі для школы цяжкія дні. Не хапала настаўнікаў. Узровень навучання ў школе панізіўся, асабліва ў малодшых класах. У 1954/1955 годзе абавязкі кіраўніка даручылі Людвіку Бартосяку. На працу паступілі Леантына Красоўская і Вера Навіцкая. 20 траўня 1955 года школа перасяляецца ў новы будынак. Ва ўрачыстасці здачы ў карыстанне будынка ўдзельнічалі прадстаўнікі ваяводскіх і павятовых улад ды шматлікая мясцовая грамадскасць.

З пачаткам навучальнага года 1955/1956 года з'явіліся праблемы. Па прычыне браку электрычнага току не працавалі водаправод ды цэнтральнае ацяпленне. Вучэбныя залы былі халодныя. У палове кастрычніка спынілі навуку. Бацькоўскі камітэт выступіў з прапановай пабудовы ўласнай электрычнай лініі і падключэння яе да чыгуначнай. З гэтай задачай камітэт справіўся, нягледзячы на вялікія кошты. У канцы лістапада ў армію прызываюць кіраўніка Бартосяка. Абавязкі загадчыка пераймае Марыя Шостак.

(працяг будзе)

Адгаданка

1. афармленне твару артыста з дапамогай фарбаў, наклеек, накладак, 2. рад невялікіх гор, 3. выспа з Нагасакі, 4. вадкі серабрыста-белы метал, 5. гарэлка з ядлоўцавым прысмакам, 6. оперная песня, 7. квадрат дзесяці, 8. тонкі слой ледзяных крышталяў на ледзяной паверхні, 9. маскоўскі манарх, 10. спартыўная сітуацыя, калі мяч выходзіць за гульнёвую пляцоўку, 11. раённы цэнтр на Гомельшчыне на рацэ Убарць, 12. сталіца Казахстана, 13. мяккая трубачка для зубной пасты, 14. прыхільнік цынізму, 15. не ўваход, 16. чалавек з вялікімі вусамі, 17. заработная плата, 18. абрэвіятура беларускай дарожнай міліцыі, 19. умелы наезнік на асядланым кані.

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — афарызм Станіслава Леца.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 30 нумара

Біблія, Відзін, Вілія, Гобі, до, мі, мыла, Уры, фуга, Чылі, шуба, Юта.

Рашэнне: **У міфалогіі людзі выявілі, што яны рабілі б будучы багамі.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лявону Федаруку** з Рыбалаў і **Мікалаю Сазановічу** з Навін-Вялікіх.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

РЭПАРТАЖ ПРА КРЫЖ, БЕЛАРУСКІЯ ПЕСНІ І ДОБРАГА ПАНА ВОЙТА!

Тэкст і фота
Ганны КАНДРАЦЮК

(пачатак у н-р 33)

Калі б сучасны жыхахар Шудзялава меў магчымасць вярнуцца на сто гадоў назад, адчуў бы сябе, мабыць, разгубленым. І сам у сябе спытаўся б: а ці трапіў я туды куды трэба? У цэнтры мясціны, на ўзгорку, дзе сёння Дом культуры, красавалася тады званіца і новая царква-мураванка пад апекай святога Юр'я. Праваслаўныя вернікі, якія на той час складалі большасць у гміне (мы маем на ўвазе сучасныя межы) былі ў захапленні. Хоць царква была пабудаваная на кошт мясцовых дваран і саміх прыхаджан, у наваколлі распаўсюджвалі сваю легенду, якая сама па сабе яшчэ больш узвышала месца, ранг і незвычайнасць будоўлі. Пры канцы XIX стагоддзя па крынска-шудзялаўскім тракце меў падарожнічаць слаўны і багаты чалавек праваслаўнага веравызнання. Таёмная асоба праўдападобна з'явілася з самога Пецярбурга. І калі ён пабачыў такую прыгожую мясціну як Шудзялава і маленькую ды драўляную царкоўку на ўзгорку ў цэнтры, адразу натхніўся на добрую і высакародную ідэю. Ён падумаў, каб запісаць у спадчыне маёмасць на пабудову царквы, якая прыгажосцю і відам дароўноўвала б красе мясціны. І так, паводле легенды, збылося. Той падарожнік быццам шукаў месца каб перад смерцю ўваткнуць кудысьці свой капітал. Бо неўзабаве пасля таго здарэння ў Шудзялава, кажуць, прыйшло паведамленне пра запавет і вялікія грошы...

У нарысах і крыніцах прачытваем больш празаічную версію здарэння; 24 красавіка 1900 года Святы Сінод паклікаў у Шудзялаве самастойную парафію. Новую царкву пабудавалі па ініцыятыве і амаль поўнасцю на кошт Аляксандра і Вольгі Аненькавых з недалёкага маёнтка Слойка і асвяцілі яе ў 1907 годзе. Будынак драўлянай царквы, той самы, што не спадабаўся быў легендарнаму падарожніку з Пецярбурга, перавезлі ў Сукавічы і пабудавалі з яго школу. У тых жа Сукавічах, як запісана ў „Клірасных ведамасцях" з 1913 года, жыла трэцяя частка ўсіх вернікаў праваслаўнай парафіі ў Шудзялаве — ажно 419 душ (парафія налічвала 14 вёсак, 232 дамы і 1 238 душ). У каталіцка-шляхоцкім Шудзялаве было толькі дзевяць праваслаўных сем'яў, дарэчы, на адну сям'ю менш як сёння. З ліпеня 2010 года ў памяць разбуранай у міжваенны час царквы, праваслаўная меншасць і каталіцкая большасць, разам, асвяцілі праваслаўны крыж.

* * *

Па дарозе ў касцёл, які знаходзіцца да кіламетра ад цэнтра, я прыгадала Эдварда і Галену Шчасновічаў, якія пахаваныя тут на каталіцкім могільніку. Мой першы прафесійны кантакт з шудзялаўскай зямлёй пачаўся ад шляхоцкіх аколіц. У жніўні 1994 года я гасцявала па запрашэнні пана Эдварда ў засценку Шчасновічы. Каб годна прыняць журналістку любімай газеты, дзень раней пан Эдвард з'ездзіў у Саколку — як пасля скажа: па лепшае віно! Я сама тую сустрэчу лічу адной з лепшых і плёных, — з яе пачалася праца над адкрываннем сакольскага музыканта Яна Тарасевіча. Пан Эдвард працаваў пісьманосцам у Бабіках і амаль дваццаць гадоў распаўсюджваў „Ніву" ў шляхоцкіх аколіцах і мужыцкіх вёсках. Сам пачаў пісаць допісы пад псеўданімам „Сук". Найбольш прыгожай хвілінай у сваім жыцці пан Эдвард лічыў выступленне „Лявоніхі",

Наваколле

Сучасны цэнтр Шудзялова

якая прыехала з канцэртам у Кнышэвічы. Ён слухаў беларускія песні і маліўся каб тая хвіліна трывала да белага рання. Бо апрача спеваў і скокаў захапіла яго адна прыгажуня. Пасля, калі спевакі ад'ехалі сваім аўтобусам, пан Эдвард сеў на матацыкл, даганіў аўтобус і ехаў за ім ажно пад Саколку. Невыпадкова прыводжу тут сантыментальна-рамантычны ўспамін пра ніўскага сябру і таленавітага карэспандэнта. Ягоная праца і ангажаванасць не пайшла з дымам, наадварот, спрычынілася да феномену якім лічу навучанне беларускай мове ў гміне. Сёння з ягонага засценку дзеці вывучаюць беларускую мову ў школе ў Бабіках. Беларускі гурток працуе таксама ў Шудзялаве. Калі год таму я наведала іхнюю школу, мяне ўразіла звестка пра калядны канцэрт у касцёле. Каб паказаць асаблівасць таго канцэрта трэба абавязкова адзначыць, што на гурток прыходзяць дзеткі без розніцы на веравызнанне, а іх апякункай з'яўляецца матушка Людміла Клімук, паланістка па адукацыі ды беларусістка, харыстка і журналістка па пасіі і зацікаўленні. Дзякуючы яе асобе ў гміннай газеце мы прачытаем пра ўсе царкоўныя і беларускія мерапрыемствы...

У касцёле, куды завітала я проста з вуліцы Банкавай, служылі імшу за дваццаць гадоў самаўрадаў. Сярод сабраных пераважалі мужчыны, — яны занялі амаль усе месцы ў правым крыле нефа. Я прысела, як гэта прынята ў вёсцы, разам з прыгожым полам, з левага боку, сярод расспяваных і размоленых цётак. Пад канец ксёндз Вацлаў Дудзюк сказаў некалькі слоў пра талерантнасць і шматкультурнасць. Шматкультурнасць параўнаў ён да жанчын у прыгожых і разнавідных сукенках, якія з асобна захапляюць, а калі разам — яны як расквечаны луг. На праваслаўнага брата, — гаварыў ксёндз, — трэба глядзець як на дар, які дапаможа грамадству быць лепшым і прыгажэйшым... Пасля ўсе заспявалі „Божэ, цось Польскэ". Калі людзі выйшлі за парог касцёла, я перажыла шок. Адразу, на сходах, яны пачалі размаўляць па-беларуску. Момант грамада вырашала пытанне: ісці пешшу ці ехаць. Жанчыны, не аглядаючыся на апошніх, рушылі ў бок пасёлка.

— То як, пане войце, паедзем ці пойдзем? — спытаўся хтосьці гаспадара гміны.

— Як гэта будзе выглядаць, — адказаў войт, — жанчыны будуць ісці, а мы сабе ехаць у машыне! Пайшлі ўсе пяшком.

Я таксама прыстала да кампаніі і думала пра квяцістую фантазію шарачковай шляхты. *(працяг будзе)*

22.08 — 28.08

(22.03. — 20.04.) Будзеш імкнуцца да чагосьці новага, у асабістым і прафесійным плане. Можаш наткнуцца на перашкоды, ды справішся з імі лягчэй чым спадзяешся. На працы атрымаеш адказнае заданне. Старайся не выдаваць грошай.

(21.04. — 21.05.) Убачыць цябе атачэнне. Вялікая ахвота да змен; рашэннямі пацэліш у дзесятку. Зрабі толькі дакладны план дзеянняў. Пільнуй дэталяў. Справішся са справамі, з якімі дагэтуль былі клопаты, ды пры дапамозе ўплывовых асоб. Добра высыпайся!

(22.05. — 22.06.) Шчырая ўсмешка лёсу. Добры настрой. Акрыляць цябе нечаканыя поспехі. Праца прынясе плён адразу. Пры знаёмстве з новай асобай поўнасцю не ангажуйся. Не плануй таксама актыўнага адпачынку.

(23.06. — 23.07.) З 26.08. (да 30.08.) вернешся да добрай формы. Захочацца табе адарвацца ад рэчаіснасці. Не будзь сантыментальным, свае думкі кіруй да будучыні. Хацеўшы вярнуць тое, што было, можаш страціць з вока сапраўды важнае. Знаёмы, які цябе калісьці падвёў, цяпер будзе як трэба. Схадзі на кансультацыю да лекара.

(24.07. — 23.08.) Твая інтэлігентнасць і ўмеласць аргументацыі сустрэнецца з вялікім прызнаннем. Да 24.08. можаш адчуваць аслабленне. 24-28.08. аформіш кожную справу. Разумна плануй свае выдаткі. На працы трымайся абранай тактыкі. Не выкладвай усіх карт на стол. У сардэчных справах стабілізацыя і спакой.

(24.08. — 23.09.) Будзеш у знакамітым настроі. Сваім энтузіязмам заразіш іншых. 24-28.08. маеш гарантаваныя поспехі. Адчуеш прыліў жыццёвых сіл, страпянешся, энергія будзе цябе аж распіраць. У час поўні Месяца ў знаку Рыб (23.08.) не выбірайся на касметычныя і прыхарошваючыя працэдуры.

(24.09. — 23.10.) Нічога не падмяцеш пад дыван; занядбаныя справы вернуцца да цябе як бумеранг. У пары цудоўна, а самотных Шаляў чакаюць перамены. Мала ахвоты на тлумныя імпрэзы. Адчуеш, што пара скрупулёзна палічыцца з рознымі справамі і трактаваць сябе сур'ёзна і сумленна. Перакладзі хірургічныя працэдуры.

(24.10. — 22.11.) Суперзабава пры поўні Месяца (24.08.); адпачынак, флірты. Плутон у трыгоне да Сонца (24-28.08.) паможа табе там, дзе патрэбны сталёвыя нервы. Здабудзеш падтрымку ўплывовых людзей, якія памогуць адчыніць табе дзверы, у якія ты не смеў пастукаць.

(23.11. — 22.12.) Знакаміта ў кампаніі. Будзеш свабодны, упэўнены, шмат людзей будзе да цябе ліпнуць. Май у каханні. На працы ўсё пойдзе гладка, калі дапільнуеш кожнай дэталі. Можаш паказацца — твае таленты і працавітасць будуць узнагароджаны. Можаш знайсці новы даход.

(23.12. — 20.01.) Да 24.08. лепш ідзі ў адпачынак, не спрачайся. Знайдзі хвіліну, каб падагнаць хвасты, упарадкуй паперы. Добра ідзе навука. Калі трапіш на мур цяжкасцей, знайдзі ў ім шчыліну. У пары новы выбух пачуццяў.

(21.01. — 19.02.) Засумуеш за трывалымі пачуццямі. Могуць паявіцца новыя сямейныя праблемы. Можаш апынуцца ў сітуацыі, з якой цяжка звыкнуцца. Дагаворышся са старэйшым Скарпіёнам. На працы не паддавайся націскам, бо доўга будзеш шкадаваць.

(20.02. — 21.03.) У час поўні Месяца (24.08.) будзеш нервовы, а прытым павольны і неабачлівы. Будуць людзі, якія могуць табе вельмі моцна зашкодзіць! Абсалютна нічога не бяры ў крэдыт і не пазычай. Запішыся на курсы танцаў.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960